ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дарожным дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. — 90 к.
„ 3 мес. 2 р. 60 к.
„ 6 мес. 5 р. —
„ 12 мес. 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок конп. пасьля тэксту—50 к., іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тэрміну, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавкі.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

НЯДЗЕЛЯ 15 ЧЭРВЕНЯ 1930 г.
№ 136 (3736)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Менск можа і павінен забясьпечыць сябе мясам,

ДЛЯ ГЭТАГА ТРЭБА БЕЗАДКЛАДНА ПАБУДАВАЦЬ ГАРАДЗКУЮ СЬВІНАВОДЧУЮ ГАСПАДАРКУ НА 25,000 ГАЛОЎ

Менскі Гарсавет, МЦРК, прафсаюзы павінны ўзяць на сябе ініцыятыву

За арганізацыю гарадзкой сьвінаводчай гаспадаркі

У БССР зараз адбываецца вялізарная работа на стварэньні сьвіняводчых саўгасаў і калгасаў. Пачынаецца ажыцьцяўленьне раду важнейшых мерапрыемстваў, якія дазволяць фарсаваць разьвіцьцё жывёлагадоўлі і ў прыватнасьці сьвіняводзтва ў БССР. У гэтым напрамку на Савецкую Беларусь Савецкім Саюзам ускладзена вялізарная задача. БССР можа і павінна забясьпечыць мясам ня толькі сябе, але і рад прамысловых цэнтраў іншых савецкіх рэспублік. У нас ёсьць усе прадпасылкі для выкананьня гэтай задачы. Значная частка асыгнаваньняў на разьвіцьцё жывёлагадоўлі (каля 30 проц.) прыпадае на БССР. Ужо гэты адзін факт сьведчыць аб тым значэньні, якое надаецца Савецкім Саюзам БССР у галіне вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі.

Усе гэтыя мерапрыемствы прадугледжаны агульна-саюзным пляном. Саюзныя органы зьвярнулі належную ўвагу па жывёлагадоўлю БССР, прымаючы над увагу яе вялізарныя магчымасьці ў гэтай галіне.

Але трэба адзначыць, што па мясцох яшчэ ня ўсё зроблена, каб паставіць на належную вышыню справу арганізацыі сьвінадкормачных пунктаў. Ня ўлічваецца поўная магчымасьць стварэньня спэцыяльных прамысловых гарадзкіх сьвіняводных гаспадарак. У гэтых адносінах вялікай увагі заслугоўвае праект дырэктара Беларускай Цэнтральнай Сьвіняводчай станцыі т. Журыка, які падаецца ім на старонках «Зьвязды», аб стварэньні ў Менску буйной прамысловай сьвіняводчай гаспадаркі. Гэтая гаспадарка зможа поўнасьцю забясьпечыць Менск мясам. Паводле думкі т. Журыка, адкіды менскіх сталовых, ачных і іншых прадпрыемстваў могуць поўнасьцю забясьпечыць сьвіняводчую гаспадарку кормам. Для гэтай справы патрэбна ўсяго каля 2-х млн. руб.

Самае аспэўнае і самае цяжкае—гэта пытаньне аб матачным матар'яле. Патрэбны 2.000 сьвіньней—матак. Часткова гэта пытаньне вырашаецца наступным чынам: 500 матак можа даць Сьвіняводчая станцыя і каля 300—рабочая каапэрацыя. Праўда, не хапае яшчэ больш паловы матачнага матар'ялу, але ўсё-ж і з азначанай колькасьці матак можна пачаць арганізацыю гарадзкой гаспадаркі. Нехапаючую колькасьць матак трэба будзе паступова загатаўляць на мясцовым рынку.

Неабходна аднак сказаць, што, зразумела, заданьне аб укамплектаваньні матачным матар'ялам сьвіняводчых саўгасаў і калгасаў павінна быць выканана ў першую чаргу. Загатоўка матак для гарадзкой гаспадаркі можа праводзіцца толькі ў звышлянавым парадку, ні ў якім выпадку не перашкаджаючы ўкамплектаваньню саўгасаў і калгасаў маткамі.

Пытаньне аб грошах можа быць таксама вырашана без асаблівых цяжкасьцяй, бо ў гэтым зацікаўлены рабочая каапэрацыя, рад мясцовых арганізацый і, урэшце, усё працоўнае насельніцтва г. Менску.

Праект т. Журыка заслугоўвае вялікай увагі і павінен быць усебакова абмеркаваны ў самым бліжэйшым часе; прыведзеныя аўтарам даныя гавораць аб тым, што ён зусім рэальны і. бязумоўна, мэтазгодны.

Менскі гарсавет, МЦРК, прафсаюзы, зацікаўленыя ў вырашэньні мясной праблемы ў рабочым Менску, павінны ўзяць на сябе ініцыятыву ў стварэньні гарадзкой сьвіняводчай гаспадаркі.

Праект беларускай сьвінаводчай станцыі

Разьвіцьцё сьвінягадоўлі мае вялізарнае значэньне для забесьпячэньня рабочых цэнтраў мясапрадуктамі. Дырэктывы партыі і ўраду зусім выразна гавораць аб значэньні справы сьвінягадоўлі. Ужо зараз праводзіцца рад мерапрыемстваў па арганізацыі сьвіняводчых саўгасаў і калгасаў. Але мала ўвагі аддаецца пытаньню разьвядзеньня сьвіней на базе гарадзкіх адкідаў.

Тыя адкормачныя базы, якія зараз існуюць у розных арганізацыях Менску, зьяўляюцца зусім прымітыўнымі і дробнымі. Трэба дабіцца поўнага скарыстаньня гарадзкіх адкідаў для адкорму сьвіней.

Такія гаспадаркі арганізаваны, напрыклад, у ПАЗШ з гадовай прадукцыяй у 50.000 таварных сьвіней кожная. Такія гаспадаркі на 75.000 сьвіней існуюць пад Вэнай.

Зараз насьпела пытаньне аб арганізацыі ў Менску прамысловай сьвіняводнай гаспадаркі на базе гарадзкіх адкідаў з гадовай прадукцыяй хаця-б у 25.000 таварных сьвіней у першы год. У далейшым лік сьвіней трэба будзе павялічыць да 100 тыс. штук у год.

Як навуковыя досьледы, так і практыка Заходняй Эўропы і ПАЗШ паказалі, што такія гаспадаркі вельмі лёгка арганізаваць і разьвіваць. Калі была арганізавана гаспадарка цэнтральнай сьвіняводнай станцыі з прадукцыяй таварных сьвіней у 2.500 штук у год, дык некаторыя «вучоныя» жывёлаводы лічылі гэта немагчымай задачай. Аднак, практыка паказала, што такая гаспадарка можа існаваць і ў ёй лепш весьці работу, чым у дробных гаспадарках. У буйных гаспадарках, пры значна натуралізаваных умовах, небясьпека эпізоты значна меншая, чым у дробных, дрэнна арганізаваных. Пры эпізоты ў такіх буйных гаспадарках надзвычай лёгка лёкалізаваць і спыніць яе пашырэньне.

Зараз у Менску сталовыя, хлебазавод, малочная, бойні, прыватныя кухні даюць шмат адкідаў. Яны часта выліваюцца вон. Тыя дробныя базы, якія мы маем у Менску не скарыстоўваюць гэтых адкідаў.

Адкормачную базу лепш за ўсё будаваць каля цэнтральнай сьвінаводнай станцыі, дзе ёсьць магчымасьць атрымаць навуковую кансультацыю і патрэбную плошчу зямлі. Пабудову можна пачаць зараз-жа. Кошт пабудовы паступны:

Будынкі для матак на 2.000 галоў*) па 80 р.—160,000 р.; будынкі для адкорму 15.000 галоў — 450.000 руб., кухня і вадазабесьпячэньне—100.000 руб., мэханізацыя—250.000 руб., пабудова жылых дамоў на 60 кватэр па 4.000—240.000 руб., аўтатранспарт—6 машын па 4 тысячы—24.000 руб.; набыцьцё матак—2.000 па 150 руб.—300.000 р., набыцьцё кныраў—30 па 200 руб.—6.000 руб.

Разам пабудова і абсталяваньне сьвінаводнай гаспадаркі будзе каштаваць—1.530.000 рублёў. Таксама трэба мець на апэрацыйныя выдаткі каля 500.000 руб.

Прадукцыя ад гэтай гаспадаркі—25.000 штук таварных сьвіней, вагою кожная—125-130 кілё ці ўбойных 100 кілё. Усяго за год будзе атрымана—2.500 тон сьвініны. Кожны дзень Менск зможа атрымаць 70 шт. сьвіней. Гэтая колькасьць забясьпечыць усё насельніцтва г. Менску сьвінінай і дасьць магчымасьць вырашыць мясную праблему.

Калі зараз прыступіць да работы, дык вясною 1931 году ўмо можна будзе атрымаць сьвіней.

Апрача чыста гаспадарачага значэньня сьвіняводная гаспадарка будзе мець навуковае значэньне, бо яна зьявіцца базай для дасьледчых мэт і для падрыхтоўкі кадраў. Трэба кінуць ганяцца за дробязямі і зараз-жа ўзяцца за справу, каб сапраўды дагнаць і перагнаць Эўропу і Амэрыку.

Зараз сьвіняводная станцыя атрымлівае запытаньні па розных арганізацыйна-тэхнічных пытаньнях са ўсяго СССР.

Калі адкрыецца саюзны дасьледчы інстытут, які будзе абслугоўваць вялікія абшары і мець некалькі зоанальных станцый у Саюзе, база сьвінягадоўлі буйнога маштабу будзе вельмі патрэбнай. На гэтай базе, як буйной прамысловай, і базе дасьледчых сьвіняводных станцый (інстытуту) будзе пабудаваны сьвіняводны факультэт (ВНУ), тэхнікум і рад школ для калгаснікаў і саўгасных рабочых.

150 навуковых працаўнікоў, якія будуць працаваць ва ўсесаюзным сьвінаводчым інстытуце, прымуць удзел у рабоце па арганізацыі буйной сьвіняворчай гаспадаркі ў Менску.

Дырэктар Беларускай Цэнтральнай Сьвіняводчай Станцыі ЖУРЫК.

*) 500 матак можа даць сьвінаводная станцыя і 300—рабочая каапэрацыя.

На шляхох да XVI партзьезду

Правільныя вехі

Прапрацоўкай тэзісаў т. Якаўлева і абгаварэньнем дыскусійных лістоў «Праўды» занята зараз уся партарганізацыя Бягомльскага раёну.

Тэзісы т. Якаўлева прапрацавалі ўжо 11 парт. ячэек з агульнага ліку 15 у раёне. Прапрацоўка адбываецца на агульных адкрытых сходах ячэек пры ўдзеле ўсіх калгаснікаў і значнага ліку беднякоў і сераднякоў некалгаснікаў. Сходы зацягваюцца да позьняга часу, а ў некаторых ячэйках (Глінск, Бярэзіна) да самае раніцы.

На сходзе Бягомльскай ячэйкі асабліва актыўнаму абгаварэньню падпаў другі разьдзел тэзісаў—«умацаваньне асноў калгаснага руху і барацьба з памылкамі». Таварышы сканцэнтравалі галоўную ўвагу на разборы памылак, якія былі ў мінулым на мясцох, у канкрэтных умовах, на праверку выпраўленьня гэтых памылак, каб у далейшым ухіліцца ад іх паўтарэньня. Адзначалосна сход ухваліў разам з іншымі пунктамі і першы пункт тэзісаў, названага разьдзелу, дзе гаворыцца, што «Калгасы могуць быць набудаваны толькі на аснове добраахвотнасьці».

На сходзе Домжарыцкай ячэйкі таварышы выказваліся аб недапушчальнасьці паспаленьня работы па далейшым разгортваньні калектывізацыі, давалі адпор адсталым настроям некаторых асобных калгаснікаў (беспартыйных), якія гаварылі: «Зараз лета—калектывізацыяй займацца няма часу».

Пункт тэзісаў аб калгасных кадрах прыцягнае ўвагу ўсіх сходаў. І гэта зразумела. Зараз калгасы наогул, і асабліва калгасы Бягомльчыны, адчуваюць вострую нястачу ў кіраўнічых работніках спэцыялістых.

Покуль што ні адзін калгас ня мае сваіх аграномаў, зоатэхнікаў, садаводаў, агароднікаў, сьвіняводаў і г. д. Раённая агранамія ня ў сілах задаволіць патрабаваньні 26 калгасаў, на плошчы 11.675 гэкт. ці 33,3 проц. плошчы да ўсяго раёну. Калгаснікі шырока падтрымліваюць мерапрыемствы, вызначаныя тэзісамі аб падрыхтоўцы калгасных кадраў, праз розныя курсы, вылучэньні, школы ды саўгасах, школы калгаснай моладзі, тэхнікумы і г. д.

Зараз у многіх мясцох (калгасы «Краіна Саветаў», «Беларусь») наглядаюцца выпадкі нездаровых узаемаадносін асобных калгаснікаў з сераднякамі некалгаснікамі. Патравы збожжа, яда па сенажаці як з аднаго, так і з другога боку і розныя іншыя дробныя факты нядобрасуседзкіх узаемаадносін у гаспадарцы падкідаюць жар клясаваму ворагу для распальваньня варожых адносін паміж калгаснікамі і працоўнымі сялянамі некалгаснікамі. Калгасныя ячэйкі вялі і вядуць змаганьне з падобнымі зьявішчамі, але і надалей гэтае пытаньне застаецца балючым.

У разьдзел тэзісаў тав. Якаўлева аб «узаемаадносінах калгасаў з індывідуальнікамі» на ўсіх сходах горача абгаворваецца. На сходзе Лесьціцкай ячэйкі калгаснікі абмяркоўвалі пытаньне практычнай дапамогі бедняком некалгаснікам у сяўбе і надыходзячай уборцы ўраджаю. Тут выявілася, што некаторыя сераднякі зараз рыхтуюцца да ўступленьня ў калгас.

На сходах Укамскай і Глінскай ячэек т. т. адзначалі вялікую карысьць ільгот для калгасаў. Тут выявілася, што некаторыя сераднякі яшчэ добра ня ўцямілі карысьці гэтых ільгот і парадку іх прадастаўленьня.

У вогуле-ж, калі падвесьці вынікі спрэчкам у абгаварэньні тэзісаў т. Якаўлева па ўсіх ячэйках, дык можна заключыць словамі калгасніка «Беларусі»: «Вехі на шляху далейшай перабудовы сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад пастаўлены правільна». Я. Ч.

Калгасьнікі абгаварваюць тэзісы ЦК

Канкрэтнымі справамі рапартуем XVI партзьезду

Тэзісы т. Якаўлева знайшлі самы жывы водгук сярод калгаснікаў калгасу імя газэты «Рабочай» (Кісялёва-будзенскі сельсавет). Калгаснікі цалкам далучаюцца да тэзісаў. **«Лепшым залогам далейшай калектывізацыі бядняцка-сераднякіх гаспадарак сельсавету і довадам нашай адданасьці партыі будзе неакладнае наладжваньне ўзаемаадносін паміж калгаснікамі і бядняцка-сераднякімі пластамі»**—заявілі калгаснікі.

У ажыцьцяўленьне гэтага сход ухваліў **у часе ўборачнай кампаніі і падрыхтоўкі да асеньняй пасеўнай кампаніі—дапамагчы сіламі калгасу бядняцкім гаспадаркам**, якія покуль яшчэ ня ўступілі ў калгас.

Ухвалена таксама арганізаваць ударныя брыгады для работы ва ўборачнай кампаніі. Сход адзначалосна пастанавіў выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва па лепшым правядзеньні надыходзячых с.-г. работ, а таксама па дапамозе бядняцкім гаспадаркам калгас імя газэты «Правда».

С. Ш.

Клімаўшчына.

Наперакор прадраканьням правых апартуністых

Усё вышэй уздымаецца хваля рэвалюцыйнага руху

РАСЬЦЕ ЛАВІНА ЗАБАСТОВАК У КРАЁХ КАПІТАЛУ

Чырвоны штандар саветаў разьвіваецца над Кітаем

ПАД ЧЫРВОНЫМ ШТАНДАРАМ САВЕТАЎ

ШАНХАЙ, 13. Падпольная камуністычная газэта «Шанхай-Бао» паведамляе **падрабязнасьці зьезду дэлегатаў з савецкіх тэрыторый у Кітаі, які адбываўся, як аказваецца, у Шанхаі ў пачатку чэрвеня. Паводле паведамленьняў газэты, у Шанхаі, ня гледзячы на бязьлітасны тэрор Нанкінскай і інтэрнацыянальнай паліцыі,** сабралася 47 дэлегатаў з савецкіх тэрыторый, занятых чырвонымі атрадамі. Дэлегаты зьезду прадстаўлялі 8 правінцый, у якіх існуюць савецкія тэрыторыі. Зьезд быў старанна падрыхтаваны. Заля пасяджэньняў была ўбрана партрэтамі Маркса і Леніна, чырвонымі кветкамі і рэвалюцыйнымі лёзунгамі.

У прынятай зьездам адозьве паказваецца на тое, што змаганьне Гаміндана і імпэрыялістых супроць кітайскіх савецкіх тэрыторый будзе ўзмацняцца па меры пашырэньня апошніх.

«Гэта пэрспэктыва, гаворыць адозва, павінна прымусіць нас рыхтаваць больш магутную рэвалюцыйную ўзброеную сілу і стварыць больш цесную сувязь з міжнародным пралетарыятам, у асаблівасьці, з пераможным пралетарыятам СССР». Зьезд выказаўся супроць праектуемага буржуазіяй і прыхільнікамі Чэн Ду-сю, (былы лідэр кампартыі Кітая, рэнегат, які блізка стаіць да яе), скліканьня, «нацыянальнага сходу». Зьезд лічыць, што «нацыянальны сход» зьявіцца толькі новай спробай ашуканства працоўных мас Кітая.

ГОРАДАМ УЛАДАЮЦЬ БАСТУЮЧЫЯ

ПАРЫЖ, 13. Як падае «Юманітэ», ГОРАД БУКО (на паўднёвым захадзе Францыі) ФАКТЫЧНА ЗНАХОДЗІЦЦА ВА ЎЛАДЗЕ БАСТУЮЧЫХ МЭТАЛІСТЫХ АДНЭЙ З БУЙНЕЙШЫХ МЭТАЛЮРГІЧНЫХ КАМПАНІЙ «МАРЭН АМКУР». Усе магазыны зачынены. Бастуючыя закрылі ўсякі подступ да заводу і на вуліцу, якая прылягае да яго. Завод заняты жандармэрыяй і абкружаны рабочымі пікетамі. Камуністычны мэр гораду ўчора адхілены на адзін месяц эд выкананьня сваіх абавязкаў за адмову выдаць абавязковую пастанову, «якая забясьпечвае парадак». (ТАСС).

ПРЫБЫЛА ЖАНДАРМЭРЫЯ НА КАПАЛЬНІ

ПАРЫЖ, 13. На дзяржаўных каліёвых блізка стаіць да ея), скліканьня, ных капальнях у дэпартаманце Верхняга Рэйну забаставала ўчора 7 тысяч вуглякопаў з агульнага ліку 10 тыс. На капальні прыбылі атрады паліцыі і конная жандармэрыя. (ТАСС).

ЧЫРВОНЫЯ ПІКЕТЫ СУПРОЦЬ ГУМОВЫХ ПАЛАК

ЭЙСЛЕБЭН, 13. З прычыны спроб дырэкцыі бастуючых прадпрыемстваў у Мансфэльдзе паставіць на работу штрэйкбрэхэраў з ліку членаў фашысцкага саюзу «Сталёвага шлему», **рэвалюцыйны забастовачны камітэт мабілізаваў забастовачныя пікеты:** пікетам удалося прагнаць з работы многіх штрэйкбрэхэраў. **У Хэльбра сход, скліканы рэвалюцыйнай прафапазыцыяй, быў разагнаны паліцыяй. У Эйслебэне** паліцыя напала на чырвоныя забастовачныя пікеты, пусьціўшы ў ход гумовыя дубінкі. У Вімэльбургу да бастуючых далучылася частка штрэйкбрэхэраў. У Эйслебэне **рэвалюцыйная прафапазыцыя перашкодзіла скліканьню сходу членаў саюзу «Сталёвага шлему».** Удзельнікі рабочай дэманстрацыі ўхвалілі пастанову не дапускаць ніякіх сходаў штрэйкбрэхэраў. Рэфармістыя прабавалі раскалоць моцны пралетарскі фронт цкаваньнем неарганізаваных рабочых і пробамі перашкаджаць абгаварэньню і прыняцьцю камуністых аб падтрыманьні неарганізаваных рабочых. **Рэвалюцыйная прафапазыцыя, якая кіруе таксама опытнай дапамогі бастуючым, накіравала ў Бэрлін першы транспарт дзяцей бастуючых.** (ТАСС).

ФАШЫСТЫЯ ПАГРАЖАЮЦЬ РАСПРАВАЙ

БЭРЛІН, 13. З Бэрна (Швэйцарыя) падаюць: «У парламэнце Вазэльскага кантону ў сувязі з закліканьнем, унесеным камуністычнай фракцыяй аб выдаленьні паліцыі па сход, скліканы ў чэрвеня камуністычнай партыяй, буржуазныя партыі патрабавалі забараніць усе камуністычныя арганізацыі, пагражаючы, у выпадку адмовы ў гэтым патрабаваньні, стварыць фашысцкія арганізацыі для барацьбы супроць «большавіцкага тэрору». (ТАСС).

РАБОЧЫЯ ПАСЕЛКІ—НА РАЗБУРЭНЬНЕ

БЭРЛІН, 13. Кіраўніцтва нямецкіх чыгунак зноў скарачае 4.000 рабочых дэпо. 1.900 чал. зусім звальняюцца, іншыя будуць працаваць пяцідзённы рабочы тыдзень. Звальненьне рабочых прывядзе да разбурэньня цэлых пасёлкаў. (ТАСС).

ВУЛІЦЫ ЗАХОПЛЕНЫ ЧЫРВОНЫМІ ФРАНТАВІКАМІ

ДАНЦЫГ, 10. У дні 7-9 чэрвеня ў Данцыгу адбываўся з'езд чырвоных франтавікоў усіх мясцовасьцяй, якія знаходзяцца недалёка ад Данцыгу. У працягу 2 дзён вуліцы Данцыгу знаходзіліся ў распарадкаваньні чырвоных франтавікоў, наладзіўшых рад дэманстрацый і мітынгаў супроць фашызму і ў абарону СССР. Дэманстрацыя, арганізаваная кампартыяй 8 чэрвеня, сабрала звыш 5.000 рабочых. (ТАСС).

Бязьдзейнасьць і безініцыятыўнасьць зрываюць сіласаваньне

Камсамол яшчэ не пераключыў свае работы на выкананьне ўзятых на сябе абавязкаў

Плян сяўбы сіласных культур і будаўніцтва сіласных ям павінен быць выкананы

Красамоўныя факты

Сапраўднае становішча справы з сіласам у Беларусі характарызуе прынятая Наркамземам БССР пастанова на гэтым пытаньні. Камісарыят Зямроботва канстатуе, што: па-першае, засеў сіласных культур у калгасах пад пагрозай зрыву і, па-другое, ні акрэа, ні Белкалгасцэнтр, ні Белсельтрэст не прынялі канкрэтных мер да ажыцьцяўленьня гэтай ударнай задачы.

Афіцыйныя даныя гавораць, што да гэтага часу Беларусь выканала плян засеву сіласных культур прыблізна на 30 проц. У сапраўднасьці-ж становішча значна горшае. Некаторыя акругі перапавялічылі свае даныя. Акрамя таго, пасевы кукурузы і сланечніку моцна пацярпелі ад замаразкаў. Патрэбен перасеў. Ці робіцца гэта на мясцох?—Невядома, хоць затрудненьняў да перасеву няма, бо насеньня хапае, рабочай сілы — таксама.

Выключная блытаніна ў падрыхтоўцы да сіласнага будаўніцтва. У гэтай справе заблыталіся ўсе, пачынаючы ад Наркамзему БССР і канчаючы калгасам. На працягу двух месяцаў крычаць аб неабходнасьці будаваць сіласныя вежы, ямы і траншэі. Да гэтага часу амаль нідзе ні адной сіласнай установкі не пабудавалі. Падрыхтоўка да будаўніцтва сіласных вежаў надобна на анэкдот, праўда, вельмі сумны. Спачатку Саюзкалгасбуд паведаміў БССР, што ён вызначаецца будаўнічы матар'ял для 350 веж. Ад Менску патрабавалася прысылка вестак, куды і каму трэба гэты матар'ял адпраўляць. Потым было прыслана другое паведамленьне аб тым, што вызначаецца матар'ял (клёпка) не на 350 веж, а толькі на 160. Калі прадстаўнік БССР прыехаў у Маскву для падпісаньня дагавору з Саюзсаўкалгасбудам і каб атрымаць матар'ял, дык выявілася, што клёпак няма. Саюзсаўкалгасбуд зьбіраўся толькі заказаць клёпку для беларускіх калгасаў на заводах БССР. Такім чынам, шмат каштоўнага часу было змарнавана беларускімі арганізацыямі зусім дарма. БССР магла даўно сама заказаць клёпачны матар'ял на сваіх заводах. Гэта гісторыя зусім ня можа служыць апраўданьнем зрыву будаўніцтва сіласных вежа, бо замедльныя органы БССР заходзе ўжо спадзяваліся на цэнтр, абсалютна не праяўляючы ніякай ініцыятывы. Ім і раней добра было вядома, што для пабудаваньня сіласных вежа патрэбна клёпка, якую можна дастаць у сябе-ж.

У сувязі са зрывам будаўніцтва сіласных вежа, асаблівае значэньне набываюць сіласныя ямы і траншэі. Іх трэба пабудаваць каля 10.000, каб выканаць заданьне Наркамзему БССР — засілаваць 1 млн. тон кармоў (заданьне Наркамзему СССР для Беларусі — 2 млн. тон). Але і на гэтым вучастку — вельмі нездавальняюча. Паводле слоў мясцовых арганізацый, зноў вінаваты Саюзсаўкалгасбуд, які абяцаў распрацаваць для БССР 7.000 чарцяжоў сіласных ям і патрэбную для іх інструкцыю. Чакалі да самага апошняга часу. Саюзсаўкалгасбуд абяцаньне ня стрымаў. Сіласныя ямы ня будуюцца, бо чарцяжоў на мясцох няма. Толькі зараз Наркамзем БССР даручыў Белсаўкалгасбуду зрабіць 100 чарцяжоў сіласных ям і разасласць іх у акругі. Гэта, аднак, не вырашае пытаньня, бо чарцяжоў патрэбна ў семсот раз больш. І тут — зноў у пазіцыі поўнае бязьдзейнасьць і безініцыятыўнасьць арганізацый БССР.

Папулярызацыя сіласаваньня ў БССР пастаўлена недапушчальна слаба. З тэхнікай гэтай справы зусім незнаёма пераважная большасьць беларускіх аграномаў, не гаворачы ўжо аб шырокай масе калгаснікаў і індывідуальнікаў. Ня гледзячы на гэта, ніякіх практычных мер да папулярызацыі сіласу і азнаямленьня з тэхнікай яго прыгатаваньня ня прынята. Амаль зусім няма літаратуры на гэтым пытаньні. Меркавалася адкрыць рад раённых двухтыдзённых курсаў па сіласаваньні на 3.500 калгаснікаў і саўгаснікаў, але да ажыцьцяўленьня гэтага вельмі карыснага мерапрыемства пакуль яшчэ ня прыступлена.

Каб пасунуць наперад справу сіласаваньня ў Беларусі неабходны выключныя мерапрыемствы.

Л. Н.

Гомсельмаш ня выконвае праграмы

Тэмп работы Гомельскага Сельмашу пагражае сарваць плян забесьпячэньня сіласарэзкамі саўгасаў і калгасаў усяго Савецкага Саюзу. Вялізарнае заданьне па сіласаваньні кармоў, якое павінна быць гэтым летам ажыцьцёўлена ўсімі рэспублікамі (ад сілясу залежыць выкананьне пляну разьвіцьця жывёлагадоўлі ў наступным годзе), ня можа быць з посьпехам выканана без мэханізацыі гэтай справы, г. зн. без сіласарэзак. Гомельскі Сельмаш—адзіны ў СССР буйны завод, які выпрацоўвае гэтыя машыны. Да 1 кастрычніка ён павінен даць звыш 1000 сіласарэзак—80 проц. прадукцыі ўсіх заводаў, якія выпускаюць сіласарэзкі.

Прымаючы пад увагу вострую патрэбу ў сіласарэзках, зборачны цэх Гомсельмашу быў датэрмінова пушчаны некалькі месяцаў таму назад. Пачаўшы з выпуску двух машын у дзень, ён зараз ужо павінен быў штодзенна даваць па 20 сіласарэзак. У сапраўднасьці-ж Сэльмаш адстае, сыстэматычна ня выконваючы сваёй выторчай праграмы. Да самага апошняга часу ён выпускаў толькі па 5 сіласарэзак, а зараз з вялікімі цяжкасьцямі дае 10-12. Акрамя таго, нават сабраныя сіласарэзкі ня могуць быць адгружаны з тае прычыны, што да іх не хапае некаторых частак.

Асноўнай прычынай гэтаму служыць тое, што ні Беларускае Мэталяаб'яднаньне, ні саюз мэталістых, ні заводзкая грамадзкасьць не ўсьвядомілі яшчэ тае вялізарнае ролі, якую павінен адыграць Гомельскі Сельмаш у пасьпяховым вырашэньні пытаньня сіласаваньня—аднаго з важнейшых фактараў вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі.

Гомсельмаш не сустракае яшчэ адпаведнай дапамогі і кіраўніцтва з боку мэталяаб'яднаньня. Заводзкая партыйная арганізацыя і заўком ня здолелі яшчэ паставіць на належную вышыню масавую работу, уцягнуць у сацспаборніцтва і ўдарніцтва пераважную большасьць рабочых.

Моцна адбіваецца на рабоце заводу адсутнасьць кваліфікаваных рабочых. Між тым, канкрэтна амаль яшчэ нічога ня зроблена, каб у самы кароткі тэрмін падрыхтаваць патрэбныя кадры.

Гомельскі Сельмаш патрабуе да сябе выключнай увагі і прыняцьця раду мер з боку ня ВСНГ, так і партыйных і прафсаюзных арганізацый.

С.

Іньіцыятыва слуцкай школьнай моладзі

Некалькі тыдняў таму назад у Бабруйску адбылася акруговая канфэрэнцыя калгаснікаў на пытаньні аб сіласаваньні. Канфэрэнцыя адзначыла, што таксама з практыкай будаўніцтва сіласных ям з мясцовых матар'ялаў па Тураўскай дасьледчай станцыі.

Гэта, аднак, не дае практычных вынікаў у Бабруйскім раёне. Да сёньняшняга дня ні ў адным з калгасаў раёну ня прыступлена да пабудовы сіласных ям і траншэй. Акрамя таго, сакратар акруговага прыцягвае раённыя калгасна-каапэрацыйныя органы да судовай адказнасьці за бязьдзейнасьць.

Мала лепшае становішча і ў іншых раёнах акругі.

На фоне гэтай пасыўнасьці заслугоўвае быць адзначанай ініцыятыва слухачоў Слуцкай школы калгаснай моладзі і прафтэхшколы, якія арганізавалі паход у калгас «Першае мая». Школьная моладзь практычна дапамагла гэтаму калгасу будаваць сіласныя ямы. Слуцкая школа калгаснай моладзі зараз пачала штодзенна пасылаць спэцыяльныя брыгады слухачоў у калгасы раёну для кіраўніцтва будаўніцтвам сіласных ям і практычнай дапамогі ў гэтай справе.

АПЭРАЦЫЙНЫЯ ЗВОДКІ

ВОРША—87,9 ПРОЦ.

ВОРША. У Аршанскай акрузе на 10 чэрвеня засеяна 248.107 гэкт. або 87,9 проц. агульнага пасеўнага пляну. Калгасамі засеяна — 86.600 гэкт. — 82,2 проц., індывідуальным сэктарам—211.507 гэкт.—89 проц. пляну.

Па збожжавых культурах плян выкананы калгасамі на 86,2 проц., індывідуальным сэктарам — 87,4 проц.; усяго пад збожжавыя культуры засеяна 137.966 гэктараў, што складае 87,3 проц. пляну.

Па тэхнічных культурах калгасы далі — 54,6 проц. пляну, індыв. сэктар — 80 проц., у сярэднім — 75,9 проц.; па ільне калгасы — 63,6 проц., індыв. сэктар — 88,8 проц., у сярэднім 83,6 проц.; па канаплях калгасы — 30,1 проц., індыв. сэктар — 42,5 проц., у сярэднім —41 проц.

ПОЛАЦАК—85,3 ПРОЦ.

ПОЛАЦАК. На 10 чэрвеня плян засеву тэхнічных культур выкананы калгасамі на 53,6 проц., індыв. сэктарам —на 51,4 проц., у сярэднім па ўсіх сэктарох — 51,9 проц. На ільне калгасы выканалі — 53,5 проц., канаплях —55,7 проц. Індывідуальны сэктар выканаў на ільне—51,4 проц., па канаплях —56,4 проц., у сярэднім плян выкананы на ільне на 61,9 проц., на канаплях —56,3 проц.

Усяго на 10 чэрвеня ў акрузе засеяна 135.079,4 гэкт., што складае 85,8 проц. засеўнага пляну. Калгасы засеялі 30.959,2 гэкт. (94 проц.), індывідуальны сэктар — 104.120,2 гэкт. (83 проц.).

Па збожжавых культурах плян у сярэднім выкананы на 84,9 проц., па бульбе—91,9 проц.

ПАПРАЎКА

У сьпісе членаў ЦК КП(б)Б («Зьвязда» № 136) па тэхнічным недагляду прапушчаны прозьвішчы т. т. Ленака і Нятрушкова, якія абраны членамі ЦК КП(б)Б.

На Савецкім Саюзе

КАЛГАССАЮЗЫ НЯ ВЫКОНВАЮЦЬ ПАСТАНОЎ ЦК

МАСКВА. Праўленьне Калгасцэнтру адзначыла, што калгассаюзы ня выконваюць пастановы ЦК УсеКП(б) і ўраду па замацаваньні «25-тысячнікаў» на рабоце ў калгасах. Ствараецца пагроза, што да канца году калгасная сыстэма ня зможа адпаведным чынам выкарыстаць мабілізаваных рабочых. Для рабочых, якія аказаліся нездольнымі да кіруючай калгаснай работы, калгассаюзы абавязаны неадкладна арганізаваць курсы па павышэньні кваліфікацыі. Праўленьне Калгасцэнтру абвясьціла Калгасцэнтру Дагестану і калгассаюзам Кіргізіі суровую вымову за няправільнае разьмеркаваньне і выкарыстаньне «25-тысячнікаў». (ТАСС).

АДЧЫНЕНЬНЕ СЕЛЬМАШБУДУ

МАСКВА. (Па тэлефону ад наш. кар.). Сёньня, 15-га чэрвеня, вялікае сьвята на фронце сацыялістычнай індустрыялізацыі СССР—у Растове на/Доне на год раней вызначанага тэрміну адчыняецца гігант - Сельмашбуд.

У сувязі з гэтым рабочы калектыў Сельмашбуду прыслаў у «Правду» рапарт XVI зьезду УсеКП(б). У рапарце паведамляюцца паступныя даныя аб становішчы будаўніцтва.

Завод мае магчымасьць гадавога выпуску сельгасмашын і прылад да 115 млн. руб. замест вызначаных 36 млн. руб. На 1 чэрвеня агульная гатоўнасьць усіх цэхаў складала 98 проц. Пабудавана 35 заводзкіх карпусоў, агульным аб'ёмам звыш 1 млн. кв. мэтраў, 51 дом, агульнай плошчай 60 тыс. кв. мэтраў, адрамантавана 1.350 станкоў, ужо пушчаных.

З 18 вытворчых цэхаў ужо працуюць 13. Выпускаюцца сялянскія хады, конныя граблі.

ТРЫ НОВЫЯ КАЛГАСЫ—У ВЫНІКУ ПРАПРАЦОЎКІ ТЭЗІСАЎ Т. ЯКАЎЛЕВА

МАГІЛЁЎ. (Наш кар.). Прапрацоўка тэзісаў тав. Якаўлева пры шырокім удзеле мас калгаснікаў і індывідуальнікаў выклікала ў Магілеўскім раёне новы прыток у калгасы.

У апошнія некалькі дзён з беднякоў і сераднякоў арганізаваліся 3 новыя калгасы ў вёсках: Астракоўшчына (14 гаспадарак), Запаточчa (17 гаспадарак), Сялец (14 гаспадарк).

Калгас у Запаточча назваў сябе імем XVI-га партзьезду.

Усе 3 калгасы арганізаваліся паводле ініцыятывы саміх беднякоў і сераднякоў. Новыя калектывы прынялі статут с.-г. арцелі і ўзьнялі хадайніцтва перад РВК аб правядзеньні ў іх зямляўпарадкаваньня.

Руйнуючы адпор правым

Ячэйкі Б

XIII зьезд КП(б)Б

Арганізацыйная справаздача Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Я. А. ВАСІЛЕВІЧА

Абвастрэньне клясавага змаганьня і пытаньне кіраўніцтва масамі

Сучасны [illegible] на часу разьвіцьця сацыялістычн[illegible] будаўніцтва тав. Сталін характарызуе наступным чынам: «зараз—гаворыць ён — у нас новая паласа разьвіцьця, якая адрозьніваецца ад старога пэрыяду — ад пэрыяду аднаўленьня. Зараз у нас новы пэрыяд аднаўлёўніцтва, пэрыяд рэканструкцыі ўсяго народнае гаспадаркі на базе сацыялізму. Гэты новы пэрыяд выклікае новыя клясавыя вэрухі, абвастрэньне клясавага змаганьня і патрабуе новых прыёмаў, перагрупоўкі нашых сіл, палепшэньня і ўзмацненьня ўсіх нашых арганізацый».

Тав. Ленін так характарызаваў задачы, якія стаяць у пераходны пэрыяд: «зьнішчэньне клясаў — справа доўгай, цяжкай і ўпартай клясавай барацьбы, якая пасьля зьвяржэньня ўлады капіталу, пасьля разбурэньня буржуазнай дзяржавы, пасьля ўтварэньня дыктатуры пралетарыяту ня зьнікае, як думатаюць пашлякі старога сацыялізму і старой сацыялі[illegible] дэмакратыі, а толькі зьмяняе свае формы, робячыся шмат у якіх адносінах яшчэ больш жорсткай»

У [illegible] ўсёй нашай работы мы маем рад эрухаў у адносінах клясавых сіл у нашым краі. Мы ўступілі ў паласу бурлівага разьвіцьця рэвалюцыйнай актыўнасьці рабочае клясы і асноўных мас сялянства, а таксама абвастрэньне супраціўленьня варожых клас і клясавых груповак сацыялістычнаму наступленьню, у выніку якога гэтыя клясы ўсё больш абмяжоўваюцца і выцясняюцца, кулак-жа — кляса вясковай буржуазіі — на базе суцэльнай калектывізацыі ліквідуецца, як кляса. Задачы, якія стаяць у сувязі з абвастрэньнем клясавага змаганьня —

«давяць адпор клясаваму ворагу і разам з гэтым перавыхаваць мільёны сялянства і дробных гаспадароў, сотні тысяч служачых, чыноўніка буржуазных інтэлігентаў, падпарадкаваць іх пралетарскай дзяржаве і пралетарскаму кіраўніцтву, перамагаць у іх буржуазныя звычаі і традыцыі, а таксама неабходна перамяхваць на глебе дыктатуры пралетарыяту і саміх пралетараў у якіх уласныя буржуазныя прадрасудкі, зьніпчацца доўгіх цяжкім масавым змаганьнем з масавымі дробна-буржуазнымі ўплывамі»

Мы вядзем змаганьне і працуем у дробна буржуазным акружэньні. Клясава варожыя нам сілы вядуць жорсткае змаганьне за сваё існаваньне. Гэтае змаганьне выражаецца ў прыватнасьці і ў тым, што яны націскаюць на ўсе зьвены дыктатуры пралетарыяту, прасякаюць у нашы клясавыя арганізацыі і з сярэдзіны перашкаджаюць, разлагаюць, вядуць шкодную работу.

Правыя апартуністыя не разгледзелі характару клясавага эруху, яны не маглі зразумець, што высунуты партыяй лёзунг самакрытыкі, змаганьне з бюракратызмам, чыстка савецкага апарату, лёзунг арганізацыі новых гаспадарчых кадраў, чыстка сацыялістых, лёзунг зьніжэньня сабекошту і карэннага паляпшэньня практыкі прафсаюзнай работы, лёзунг: «дагнаць і перагнаць» у сэнсе тэхнікі і прадукцыйнасьці перадавых капіталістычных краі, лёзунг пашырэньня і ўзмацненьня калгаснага і саўгаснага руху, лёзунг наступленьня на кулака — паваротны лёзунг ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, — што ўсе гэтыя лёзунгі выходзяць з асноўнай установкі партыі — паскорыць тэмпы пабудовы сацыялізму.

Правыя апартуністыя не зразумелі, што ўсе гэтыя лёзунгі выходзяць з таго, што ўсё наша сацыялістычнае будаўніцтва перайшло на новую вышэйшую ступень. Правыя апартуністыя не зразумелі, што дзеля таго, каб перамагчы супраціўленьне клясавага ворага, ачысьціць шлях для прасоўваньня сацыялізму, трэба, апрача ўсяго іншага, ачысьціць усе нашы арганізацыі ад бюракратызму, палепшыць іх кадры, мабілізаваць мільённыя масы рабочае клясы і працоўных пластоў вёскі супроць капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі.

Пытаньне аб кіраўніцтве масамі ў пэрыяд фарсаванага наступленьня на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, паскоранага тэмпу сацыялістычнай рэканструкцыі зьяўляецца адным з асноўных пытаньняў усёй нашай партыі. Вырашэньне гэтай задачы залежала і залежыць ад таго, як мы здолеем перабудаваць працу ўсіх нашых арганізацый у адпаведнасьці з новымі ўмовамі працы і новымі задачамі.

Пытаньне кіраўніцтва працоўнымі масамі і адпаведная перабудова працы ўсіх арганізацый вострa стаяць яшчэ і таму, што мы зьяўляемся сьведкамі вялікай актыўнасьці мас, зьяўляемся сьведкамі росту іх культурнага ўзроўню. Пытаньне зводзіцца да таго, наколькі партыі ўдалося за справаздачны пэрыяд узмацніць сваё кіраўніцтва працоўнымі масамі, узмацніць свой уплыў у масавых арганізацыях, якія акружаюць партыю, наколькі партыі ўдалося палепшыць свой склад, палепшыць сваю работу наогул, падрыхтоўку і вылучэньне кадраў, і наколькі партыі ўдалося палепшыць унутранае жыцьцё сваіх арганізацый.

Я пераходжу да паасобных пытаньняў. Агаворваючыся, што паколькі мой даклад зьяўляецца працягам дакладу тав. Гея, зразумела, я ня буду закранаць у сваім дакладзе рад агульных праблем, на якіх падрабязна спыняўся тав. Гей.

Аб саветах

З гэтай групы пытаньняў я бяру толькі два пытаньні: аб складзе сельсаветаў і аб кіраўніцтве сельсаветаў працэсамі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і як саветы сапраўдныя калектывізацыі і правядзеньню веснавой пасеўнай кампаніі.

Сацыяльны склад сельсаветаў зьмяніўся ў лепшы для нас бок.

Работа сельсаветаў бясспрэчна ўзмацнілася. Але ў сучасны пэрыяд вялізарнага калгаснага руху мы назіраем, што ва многіх месцах гэты вялізарны рух праходзіў мала сельсаветаў. Без іх арганізуючага ўплыву, без іх дапамогі і без іх кіраўніцтва. Калі спачатку ў радзе месц сельсаветы цягнуліся ў хвосьце калгаснага руху і не кіравалі ім, дык потым, калі калгасны рух захапіў сельсаветы, многія з іх дзеля таго, каб стаць на чале, пачалі займацца дэкратаваньнем і адміністраваньнем калектывізацыі, падганяць і калектывізаваць і ў выніку гэтага яны зноў такі не стаялі на чале калгаснага руху.

Я думаю, што гэта тлумачыцца ня толькі тым, што сельсаветы ня былі прадаадольны, трэба гэта тлумачыць і тым, што сувязь з масамі ў сельсаветаў была і ёсьць невыстарчальная. Трэба дабіцца ўзмацненьня кіраўнічай ролі з боку сельсаветаў, дабіцца ўзмацненьня сувязі сельсаветаў з масамі, трэба дабіцца, каб сельсаветы сапраўды працавалі праз масы, разам з масамі, і тады ня будзе такога становішча, калі сельсаветы адстаюць або забягаюць наперад.

Сельсаветы, выходзячы з новых задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, не перабудавалі сваёй работы на падставе гэтых новых задач. Тут віна ўжо ня толькі нізавых арганізацый, тут віна акруговых і цэнтральных арганізацый разам з ЦВК. Трэба зараз узмацніць кіраўніцтва больш кіраваць перабудовай працы сельсаветаў, дапамагаць парадаю, іншымі відамі дапамогі дзеля таго, каб сельсаветы на вёсцы арабіліся сапраўдным вагаром, які ажыцьцяўляе дыктатуру пралетарыяту

Работа з беднатой

Мы маем у гэтай галіне пэўныя посьпехі. Да XII зьезду КП(б)Б арганізацыі беднаты ня былі разьвіты. Зараз мы маем пры сельсаветах, камітэтах узаемадапамогі, каапэрацыі ўсіх відаў па 7 акругах 2.200 груп беднаты, у якіх ўваходзіць 33 тысячы батракоў, беднякоў і пэўная частка малазаможных сераднякоў. Вось сацыяльны склад груп беднаты: батракоў і сельска - гаспадарчых рабочых 70 проц., беднякоў 80 проц. малазаможных сераднякоў — да 10 проц. Як бачыце, сацыяльны склад здавальняючы. Калі ўзяць пад увагу, што камуністычная праслойка сярод кіраўнікоў групаў беднаты 92,6 проц. (партыйцы і камсамольцы), дык здавалася-б, што праца гэтых груп і актыўнасьць іх забясьпечана. Аднак, у сувязі з тым, што значная колькасьць кіраўнікоў груп беднаты зьяўляецца «мёртвымі душамі» і не працуе, а толькі прымацавана. — фабрычнае кіраўніцтва групамі беднаты нездавальняючае. Мы бачым у сувязі з гэтым невыстарчальную мабілізацыю да гэтага часу беднаты на выкананьне і правядзеньне важнейшых мерапрыемстваў партыі на вёсцы.

У радзе месц ёсьць права - апартуністычная недаацэнка работы сярод беднаты, галоўным чынам, у нізавых зьвеньнях. Рад савецкіх і каапэрацыйных акруговых і цэнтральных установ таксама недаацэньваюць работы сярод беднаты. Прычым трэба сказаць, што мы належнага змаганьня з гэтай правааапартуністычнай недаацэнкай работы сярод беднаты, змаганьня рашучага, бязьлітаснага, не вялі. Задача тут перад намі стаіць ясная: дабіцца рашучага пералому ў гэтай галіне.

Прафсаюзы

Колькасны рост членаў прафсаюзаў вялікі. З 1928 па 1930 г. мы маем рост на 36 тысяч чалавек: з 230 тысяч да 266 тыс. Калі ўзяць колькасьць рабочых у цэнзавай прамысловасьці, дык на 1 студзеня 1926 году мы мелі 24 тысячы, на 1 студзеня 1930 г. — 45 тысяч. Удзельная вага фабрычна - заводзкага пралетарыяту ў складзе членаў прафсаюзаў і ў складзе працоўнага насельніцтва павялічылася, і гэта, таварышы, зьяўляецца паказальнікам індустрыялізацыі нашага краю і ўзмацненьня дыктатуры пралетарыяту.

Сілы рабочае клясы вырасьлі, вырасла і арганізаванасьць рабочае клясы. Прафсаюзы сапраўды зьяўляюцца арганізацыяй, аб'ядноўваючай усю рабочую клясу на добраахвотных падставах: сёньня прафсаюзы працуюць лепш, чым учора. Прафсаюзы ўжо зрабілі бясспрэчна крок наперад у галіне перабудовы сваёй работы. Аднак, трэба таксама рашуча падкрэсьліць, што тэмпы і якасьць перабудовы работы прафсаюзаў не адпавядаюць яшчэ нашым сучасным задачам, нашым запатрабаваньням, а галоўнае — узросшай актыўнасьці мас. Вазьмем толькі два пытаньні з усіх пытаньняў работы прафсаюзаў, сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва. Калі паставіць пытаньне рубам ці выстарчальным было кіраўніцтва гэтым вялізарным рухам рабочае клясы, гэтым энтузіязмам рабочае клясы, які вылівіўся ў сацспаборніцтве і ўдарніцтве, ці сталі прафсаюзы на чале гэтага руху. Я думаю, што самі таварышы з прафсаюзаў, на чале з тав. Рыжовым, скажуць, што невыстарчальна, што тут рад прарываў ёсьць.

Калі паставіць другое пытаньне — ці перабудавалі прафсаюзы работу так, каб [illegible] форма і мэтады работы, ці зьмянілася сутнасьць, зьмест работы ў зьвязку з перайменаваньнем, перабудовай, рэарганізацыяй аддзелаў у сэктары, дык я думаю, што можна сказаць, што ў радзе месц шыльда толькі была зьменена.

Таварышы, я спынюся на двух пытаньнях, якія паказ[illegible]ць у прыватнасьці, наколькі вялізарныя задачы стаяць зараз у нашай рабоце па абслугоўваньні, з аднаго боку, рабочае клясы і членаў прафсаюзаў,—а з другога боку, па ўцягненьні рабочай клясы ў сацыялістычнае будаўніцтва, па перавыхоўваньні рабочае клясы, па клясавай загартаванасьці, па інтэрнацыянальным выхаваньні, асабліва тэй часткі рабочае клясы, якая ня так даўно прышла ў прамысловасьць.

Я бяру пісьменнасьць. Бяру толькі рабочых.

Статыстычным сэктарам Дзяржпляну была абсьледавана цэнзавая прамысловасьць, былі перапісаны рабочыя цэнзавай прамысловасьці, — чыгуначных майстэрань, дэпо, у лютым 1930 г. і вось вынікі.

У большасьці галін нашае прамысловасьці мы маем сярэдні процант няпісьменных — 10 проц., а ў тэкстыльнай прамысловасьці мы маем 16,2 проц. няпісьменных рабочых, з іх 20,3 проц. жанчын.

Таварышы, ці не зьяўляюцца гэтыя лічбы довадам таго, што неабходна задачу ліквідацыі няпісьменнасьці сярод рабочае клясы ва што-б там ні стала ў бліжэйшыя часы вырашыць, і што гэта задача не вырашаецца належным чынам. Таварыства «Прэч няпісьменнасьць», пашы органы наразьветы і прафсаюзы на культурнай лініі, як бачыце, зрабілі невыстарчальна для таго, каб не дапусьціць такога ганебнага становішча.

Другое пытаньне аб сацыяльным паходжаньні нашых рабочых. Гэты перапіс паказвае (тут трэба агаварыцца, што абсалютнай веры гэтым лічбам у мяне асабіста няма, але агульную арыентоўку яны даюць), што мы маем у Беларусі 53 проц. рабочых, запятых у сучасны момант на бытворчасьці, якія зьяўляюцца «потомственными» пралетарамі, рабочымі і дзецьмі рабочых сем'яў. 47 проц. разьмяркоўваецца так: 23 проц. сяляне і дзеці сялян, прычым не паказана, якіх сялян

Саматужнікаў — 11 проц., служачых — 10,3 проц. і некаторая частка былых гандляроў і з сем'яў гандляроў —1,2 проц. Па вытворчым стажы мы маем такое становішча — да двух год 22 проц., ад 2 да 4 год — 21,9 проц. — мы маем прыблізна 44 проц. рабочых у цэнзавай прамысловасьці з вытворчым стажам 4 год і менш, а калі вы дадасьцё да іх рабочых з вытворчым стажам ад 5 да 9 год, дык мы будзем мець 65 проц. рабочых, якія ня бачылі капіталістычных фабрык.

Аб чым гэта гаворыць? Гэта гаворыць аб неабходнасьці энэргічных масавых мерапрыемстваў і выразнай, ясная установкі на клясавым і інтэрнацыянальным выхаваньні рабочых.

Дзяржаўны апарат

Я думаю, таварышы, можна сказаць і кожны гэта бачыць, што наш дзяржаўны апарат за справаздачны пэрыяд палепшыўся. Ён абсалютна і адносна скарочан, пралетарская праслойка агульнага складу і кіруючых кадраў некалькі павысілася, а таксама некалькі павысілася і партпраслойка ў дзяржаўным апараце. Тут мы можам падкрэсьліць тую вялікую работу, якая прароблена ЦКК РСІ ў сэнсе скарачэньня і палепшэньня дзяржаўнага апарату.

Даныя перапісу, які быў нядаўна праведзен статсэктарам Дзяржпляну і які закрануў 19.593 служачых (у гэты перапіс трапілі апараты наступных устаноў: судова - следчыя, выдавецтва, сацыяльнае страхаваньне, дзяржаўнае страхаваньне, крэдытовыя ўстановы і кіруючы апарат каапэрацыі), гаворыць наступнае. У дзяржаўным апараце мы маем праслойку членаў і кандыдатаў КП(б)Б — 18,2 проц. Камсамольцаў — 5,5 проц., у каапэрацыйным апараце камуністычная праслойка складае 21 проц., а камсамольская — 5 проц. Партыйная праслойка сярод кіруючага пэрсаналу дзяржапарату складае 47 проц., сярод навуковых работнікаў і спэцыялістых — 6 проц., сярод кантрольна - інструктарскага і інспэктарскага апарату — 18 проц.

Сацыяльны склад служачых мае такі малюнак у нашым дзяржаўным апараце: рабочыя і дзеці рабочых складаюць 21 проц., служачыя і дзеці служачых—41 проц., сяляне і дзеці сялян — 32 проц. У каапэрацыйным апараце рабочыя і дзеці рабочых складаюць 20 процантаў, служачыя і дзеці іх 61 проц., сяляне і іх дзеці — 11 проц. і іншыя складаюць 6 проц. у каапэрацыйным апараце і 4 проц. у дзяржаўным апараце.

Нездавальняючая партыйная і камсамольская праслойка, а таксама нездавальняючы сацыяльны склад ставіць рубам задачу палепшэньня партыйнай і камсамольскай праслойкі ў дзяржаўным і каапэрацыйным апаратах і палепшэньня сацыяльнага складу служачых у першую чаргу за кошт пралетарскіх кадраў. Такое становішча, якое мы маем зараз, не забясьпечвае таго, што мы будзем мець правільнае правядзеньне нашых дырэктыў.

Задача палепшэньня нашага дзяржаўнага апарату, далейшая яго рацыяналізацыя для скарачэньня і патаньня зьяўляецца важнейшай задачай сёньняшняга дня.

Каапэрацыя

Колькасьць ахопленых каапэрацыяй за апошнія гады павялічылася досыць значна. Калі ў 1927-28 г. мы мелі ахопленых каапэрацыяй 635 тысяч чалавек, то ў 1928-29 г. мы маем ужо 741.500 чал., а на сёньняшні дзень мы маем прыблізна 900.000 чал. Гэтыя лічбы паказваюць павышэньне арганізаванасьці працоўных мас, адначасова гэта гаворыць і аб тым, што ў нас палепшылася сувязь паміж каапэрацыяй і масамі.

Аднак, трэба, таварышы, адзначыць, што мы, мякка кажучы, ня досыць перабудаваліся для лепшага абслугоўваньня спажыўца праз крамы і сталовыя. Тут справа абстаіць выключна дрэнна.

Становішча з разьмеркаваньнем тавараў у крамах, становішча з грамадзкім харчаваньнем, становішча з культурнай работай сярод пайшчыкаў, я думаю, можна характарызаваць, як становішча абсалютна нездавальняючае, як становішча, якое трэба ўзяць пад жорсткі агонь самакрытыкі. Сацыяльны, партыйны і камсамольскі склад у каапэрацыйных органах павінен рэзка зьмяніцца, бо з такім сацыяльна - падабраным апаратам, як сёньня, мы ня можам вырашаць тых праблем, якія стаяць перад намі. Камуністыя і камсамольцы, рабочыя, якія там працуюць перагружаны работай, іх там мала для таго, каб яны маглі павесьці гэту вялізную махіну. Трэба пасьлаць у каапэрацыю рабочых, камсамольцаў, камуністых. Разважаньні аб тым, што новы рабочы, камуністы, камсамолец, ніколі не працаваўшы ў каапэрацыі, ніколі не гандляваўшы, ня зможа замяніць каапэратара — бюракрата, чыноўніка, які не жадае, ці фармальна праводзіць дырэктывы партыі, зьяўляюцца небясьпечнымі, зьяўляюцца правай баязьні новых людзей, недаацэнкай новых сіл, новых кадраў, пралетарскіх кадраў, новых камуністычных і камсамольскіх кадраў.

Рашуча ставячы задачу аб неабходнасьці палепшэньня матар'яльнага і культурнага абслугоўваньня спажыўца, ставячы рубам задачу аб неабходнасьці палепшэньня грамадзкага харчаваньня, трэба яе ўвязаць з палепшэньнем сацыяльнага, партыйнага і камсамольскага складу каапэрацыйнага апарату, бо бяз гэтага задача ня можа быць выканана.

Добраахвотныя таварыствы

Мы маем саюз ваяўнічых бязбожнікаў. У 1929 г. было 40.000, у 1930 г.— 101.000 членаў і 41.000 юных бязбожнікаў. Ня гледзячы на гэты рост, саюз ваяўнічых бязбожнікаў можна характарызаваць, як сонную арганізацыю, якая не вызначаецца вялікай актыўнасьцю. Хто з вас дзе-небудзь чуў пра актыўную работу гэтага саюзу ваяўнічых бязбожнікаў, каб ён сапраўды «ваяваў». Гэта арганізацыя проста сьпіць. Выпусьціць якую-небудзь адозву, скліча сход і больш нічога. Саюз ваяўнічых бязбожнікаў трэба па-бальшавіцку разбудзіць, трэба, каб ён актыўна ўзяўся за ажыцьцяўленьне тых вялікіх задач, якія стаяць у галіне антырэлігійнай прапаганды.

У МОПР'ы ў канцы 1928 г. было 200.000 членаў, у 1930 г.—300.000. Гэта арганізацыя наогул баявая і актыўная— мае рад і недахопаў, галоўным чынам, у сэнсе вядзеньня наогул растлумачальнай, агітацыйнай работы, культурнай работы сярод сваіх членаў

Асоавіяхім

На вялікі жаль, Асоавіяхім мог даць весткі аб тым, якое ў яго становішча з колькасным складам толькі на кастрычнік 1929 г. Я ня ведаю, чым гэта тлумачыць, ці згубілі весткі, ці не пасьпелі яшчэ ўлічыць з кастрычніка 1929 г., але калі гэта, таварышы, адкінуць і паглядзець работу Асоавіяхіму, то я думаю, што яе можна характарызаваць наступным чынам. Перш за ўсё лічбы: ёсьць звыш 200.000 членаў. Вядзецца вялікая прапагандысцкая работа. У часе манэўраў Асоавіяхім арганізаваў спэцыяльныя асоавіяхімаўскія атрады. Але гэта арганізацыя не адчуваецца яшчэ ў нас у Беларусі на сёньняшні дзень, як масавая баявая арганізацыя, якая зьяўляецца дапаможнікам Чырвонай армії. Яна яшчэ ня вышла са стадыі гурткоў, ня вышла са стадыі спроб вопыту арганізацыі атрадаў, арганізацыі дружын. Мы сёньня ня маем у выглядзе Асоавіяхіму такой арганізацыі, якая ў патрэбны час зьявілася-б сапраўды баявым дапаможнікам. У яе некаторая раскіданасьць, невыстарчальная згуртаванасьць. Асоавіяхім павінен стаць баявой арганізацыяй.

Работа сярод жанчын

Усім таварышом вядома, што ў часе ра[illegible]ваньня ў раёнах суцэльнай калектывізацыі мы мелі на вёсцы рад выпадкаў, калі жанчына выступала актыўна, супроцьдзейнічала высяленьню, супроцьдзейнічала раскулачваньню. Мы тлумачылі гэта і зараз тлумачым тым, што была праведзена невыстарчальная работа сярод батрачак, бяднячак і сераднячак. Там, дзе работа была праведзена, як належыць, там становішча было зусім іншым.

Я бяру актыўнасьць жанчын на прадпрыемствах. Яна характарызуецца наступнымі паказальнікамі: мы на 160 прадпрыемствах у сацыялістычным спаборніцтве маем: сярэдні ўдзел мужчын і жанчын—75,5 проц., мужчын—74, жанчын 79, па лініі моладзі: мужчын—74 проц., жанчын—81 проц. З усіх ударнікаў—мужчыны ёсьць 44 проц., жанчын —47 проц. Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што актыўнасьць жанчын-работніц узрасла, ня толькі дарослых жанчын, але і моладзі, актыўнасьць жанчын ня толькі ня ўступае актыўнасьці мужчын, а часта яе перавышае.

Гэта гаворыць аб вялікай рабоце, якая праведзена партыяй на прадпрыемствах па рабоце сярод жанчын.

На вёсцы мы маем у савецкім будаўніцтве ўдзел жанчын наступны: у сельсаветах у 27 годзе было 7 проц., у 1929 г. 10 проц.; у месцачковых саветах—12 проц. у 1929 г.—26 проц. у райвыканкомах—9—19 проц.; у акрвыканкомах—8-19 проц. Дэлегацкіх сходаў яшчэ ў 1928-29 г. было 937, а зараз—1.154, дэлегатак было 29, зараз—31. Гэта гаворыць аб тым, што работа вялася за справаздачны пэрыяд сярод работніц, батрачак, бяднячак, сераднячак вялікая. Аднак, мы і на прадпрыемствах, і на вёсцы маем недаацэнку работы сярод жанчын з боку паасобных зьвеньняў партыйных і камсамольскіх арганізацый.

Па-мойму, з усёй рашучасьцю трэба паставіць пытаньне так: пры рэарганізацыі партыйнага апарату з мэтай больш выразнай работы, больш выразнага кіраўніцтва, меркавалася, што партарганізацыі, партыйныя камітэты, парт'ячэйкі возьмуцца цалкам за работу сярод жанчын. Аднак, у радзе выпадкаў уся работа скінута толькі на жансэктар.

Я думаю, што можна характарызаваць працу сярод работніц, батрачак, бяднячак і сераднячак у справаздачны пэрыяд, як працу ня зусім здавальняючую. Шмат было зроблена, інакш ня было-б гэтых станоўчых паказальнікаў, але мы маем і прарывы, і недаацэнку ў адпаведных зьвеньнях таго, што патрэбна ўсёй арганізацыі весьці працу сярод жанчын.

Зьезд, мне думаецца, павінен выставіць лёзунг—больш рашуча ўзяцца ўсёй арганізацыі за працу сярод працоўных жанчын, асабліва зараз у вёсцы.

Самакрытыка

Вялікую ролю адыгрывае самакрытыка, якая разгортваецца ў нас усё яшчэ марудна і нерашуча ў паасобных месцах. Тав. Гей даволі падрабязна і вычэрпваюча характарызаваў становішча самкрытыкі на Беларусі. Я цалкам і поўнасьцю згодзен з усімі палажэньнямі, высунутымі ім у дакладзе, але з свайго боку я лічу патрэбным падкрэсьліць, што мы павінны сёньня таксама зьвярнуць увагу на якасьць выкарыстоўваньня намі гатоўнасьці мас выправіць пашы памылкі, вырыць злачынствы, выкрыць бюракратызм.

Часта няма неабходнага давер'я да мас, няма давер'я да таго, што масы могуць крытыкаваць правільна, а часта бываюць такія настроікі, што больш няправільна будуць крытыкаваць. Я думаю, што гэта немалаважная прычына прарываў у некаторых месцах у галіне самакрытыкі. Я думаю, што варта адзначыць, што сей-той сваю ўласную ізаляцыю ад мас разумее, як варожыя адносіны да партыі, да савецкае ўлады з боку паасобных груп рабочых, беднаты.

Зараз перад намі стаіць задача рашучага пашырэньня і разгортваньня самакрытыкі, якая невыстарчальна ў нашых беларускіх арганізацыях разгорнута. Побач з узмацненьнем адзінаначальля, адказнасьці за працу кожнага з нас, з тым, каб забясьпечыць новыя і новыя кадры будаўнікоў сацыялізму і сапраўдную гарантыю ад перараджэньня і адрыву ўсіх нашых апаратаў ад мас;—забясьпечыць ад правых і «левых» апартуністычных скажэньняў лініі партыі—нам патрэбна ўсе сілы кінуць на выпраўленьне недахопаў, зьвязаных з невыстарчальным і нерашучым разгортваньнем самакрытыкі ў нас, у беларускіх арганізацыях.

Пытаньне аб кадрах і змаганьне за лінію партыі

Кажучы аб падрыхтоўцы кадраў і аб вылучэньні рабочых на адказную работу, трэба мець на ўвазе тую шкоду, якую партыі нанесьлі правыя апартуністыя, і ў першую чаргу прышчэпаўшчына. Нам прыдзецца доўгі час выкарчоўваць яшчэ рэшткі прышчэпаўшчыны, якая пусьціла глыбокія карэньні. Нам, праўда, удалося ў асноўным ліквідаваць ранейшую лінію Наркамзему, якая была стаўкай на капіталістычныя элемэнты і на разьвіцьцё гэтых элемэнтаў на вёсцы. Я кажу—нам удалося ліквідаваць гэту лінію ў асноўным, у асноўным таму, што ў паасобных кутках наркамземіўскага апарату старыя тэндэнцыі дзе-ні-дзе яшчэ прарываюцца. Змаганьне за генэральную лінію ў зямельным пытаньні, за калектывізацыю, за саўгаснае будаўніцтва трэба весьці яшчэ і ў далейшым і ў наркамземіўскім апараце, паколькі там засталіся яшчэ рэшткі старых прышчэпаўскіх тэндэнцый. Нам прыдзецца яшчэ доўгі час весьці змаганьне з прышчэпаўшчынай і з хутарамі, якія прышчэпаўшчына насалзіла. З другога боку, у нас ня зьнішчана глеба, на якой разьвіваюцца капіталістычныя элемэнты ў сельскай гаспадарцы, якія характарызуюць тэндэнцыю да капіталістычнага разьвіцьця сельскай гаспадаркі наогул. Гэтыя тэндэнцыі маюць сваіх ідэолёгаў нацыянал-дэмакратаў, якія яшчэ сядзяць у нашым апараце, а таксама знаходзяць падтрыманьне з боку праваапартуністычных элемэнтаў. Таму трэба ўзмацніць барацьбу з капіталістычнымі тэндэнцыямі, іх ідэолёгамі нацыянал-дэмакратамі і з правым ухілам і нацыянал-апартунізмам.

Нельга сказаць, каб прарывы, якія мелі месца на культурным фронце, далікам ліквідаваны. Напрыклад, пры наборы ў гэтым годзе ў с.-г. каледжы дыбоўцы 300 чал. у абсалютнай большасьці рабочых, камсамольцаў і камуністых, ня была выканана. Цэнтральны Камітэт прымушан быў у другі раз разгледзець гэтае пытаньне і прымусіць выканаць. Мы, наёсты сур'ёзны ўдар беларускаму нацыянал-апартунізму, нацыянал-дэмакратызму і праваму ўхілу, прышчэпаўшчыне, маем яшчэ, аднак, у розных мясцох праяўленьне нацыянал-апартунізму, нацыянал-дэмакратызму і праваго апартунізму ў нашых культурных апаратах, у апаратах, якія кіруюць культурным будаўніцтвам.

Мы яшчэ сустракаемся будзем сустракацца з прарывамі. З гэтымі прарывамі Цэнтральны Камітэт за справаздачны пэрыяд вёў бязьлітасную барацьбу. Гэтыя прарывы і ў далейшым могуць яшчэ мець месца ў сувязі з моцным націскам капіталістычных элемэнтаў на наш апарат, на нашу арганізацыю, на камсамол і рабочую клясу, і ў сувязі з абвостраным клясавым змаганьнем. Вядучы непрымірымае змаганьне за генэральную лінію партыі, не супакоўваючыся на тым, што нанесьлі рашучы ўдар па розных ухілах, нам трэба і ў далейшым вырашаць праблему кадраў пад кутом погляду колькаснага і якаснага вырашэньня гэтай праблемы. Пад якасным вырашэньнем трэба разумець бальшавіцкую пралетарскую загартаванасьць, бальшавіцкае выразнае правядзеньне генэральнай лініі партыі.

Праблема кадраў зьяўляецца, у прыватнасьці ў нас на Беларусі, надзвычай вялікай і вострай праблемай, якая павінна вырашыцца з усёй бальшавіцкай рашучасьцю і ад вырашэньня якое залежыць і правядзеньне генэральнай лініі партыі, і тэмп і якасьць нашага будаўніцтва.

Пройдзены пэрыяд паказаў, што мы ў сувязі з прарывамі, меўшымі месца ў радзе галін нашага будаўніцтва, маем у кадрах адсеў. Частка кадраў, у тым ліку і кіруючых кадраў не апраўдала сабе. Частку трэба было выкінуць з партыі, частку трэба было замяніць.

З другога боку задачы, якія зараз стаяць перад намі, патрабуюць значна большай колькасьці кадраў. Верасьнёўскі пленум у 1929 г. і студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б у 1930 годзе з усёй сілай паставілі перад КП(б)Б гэтую праблему.

Партыя ў значнай ступені ачысьцілася ад тых элемэнтаў, якія арасьліся з варожымі элемэнтамі, ад элемэнтаў, якія разьлажыліся. Але, таварышы, нельга лічыць, што ў нас па сёньняшні дзень такое становішча, што ў Наркамземе, Наркамасьвеце, дасьледчых установах, у Акадэміі Навук і ва ўсіх нашых установах і арганізацыях мы ачысьціліся канчаткова ад гэтых элемэнтаў. Гэтыя элемэнты ёсьць, і мы кожны дзень у рабоце гэта адчуваем. Тым больш стаіць востра праблема кадраў і іменна пралетарскіх кадраў.

Я, таварышы, бяру некаторыя лічбы аб нашых патрэбах. Калі ўзяць тое, што нам патрэбна ў пяцігодку, дык атрымліваецца наступны малюнак: па спэцыялістых з вышэйшай асьветай нам патрэбна 12,5 тыс., будзе выпушчана каля 5.000. Па спэцыялістых з сярэдняй асьветай—26.000, будзе выпушчана 14,5 тыс. Інжынэрна-тэхнічных сіл усіх галін народнай гаспадаркі—да 4.000 патрэбна, будзе выпушчана звыш 600 чал. Выразна кідаецца ў вочы колькасны недахоп у кадрах для абслугоўваньня народнае гаспадаркі. Тым больш, зразумела, трэба рашуча выканаць задачу гэтае пытаньне і прымусіць выканаць. Мы, наёсты сур'ёзны ўдар беларускаму нацыянал-апартунізму, нацыянал-дэмакратызму і праваму ўхілу, прышчэпаўшчыне, маем яшчэ, аднак, у розных мясцох праяўленьне нацыянал-апартунізму, нацыянал-дэмакратызму і праваго апартунізму ў нашых культурных апаратах, у апаратах, якія кіруюць культурным будаўніцтвам.

Мы яшчэ сустракаемся будзем сустракацца з прарывамі. З гэтымі прарывамі Цэнтральны Камітэт за справаздачны пэрыяд вёў бязьлітасную барацьбу. Гэтыя прарывы і ў далейшым могуць яшчэ мець месца ў сувязі з моцным націскам капіталістычных элемэнтаў на наш апарат, на нашу арганізацыю, на камсамол і рабочую клясу, і ў сувязі з абвостраным клясавым змаганьнем. Вядучы непрымірымае змаганьне за генэральную лінію партыі, не супакоўваючыся на тым, што нанесьлі рашучы ўдар па розных ухілах, нам трэба і ў далейшым вырашаць праблему кадраў пад кутом погляду колькаснага і якаснага вырашэньня гэтай праблемы. Пад якасным вырашэньнем трэба разумець бальшавіцкую пралетарскую загартаванасьць, бальшавіцкае выразнае правядзеньне генэральнай лініі партыі.

Праблема кадраў зьяўляецца, у прыватнасьці ў нас на Беларусі, надзвычай вялікай і вострай праблемай, якая павінна вырашыцца з усёй бальшавіцкай рашучасьцю і ад вырашэньня якое залежыць і правядзеньне генэральнай лініі партыі, і тэмп і якасьць нашага будаўніцтва.

Пройдзены пэрыяд паказаў, што мы ў сувязі з прарывамі, меўшымі месца ў радзе галін нашага будаўніцтва, маем у кадрах адсеў. Частка кадраў, у тым ліку і кіруючых кадраў не апраўдала сабе. Частку трэба было выкінуць з партыі, частку трэба было замяніць.

З другога боку задачы, якія зараз стаяць перад намі, патрабуюць значна большай колькасьці кадраў. Верасьнёўскі пленум у 1929 г. і студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б у 1930 годзе з усёй сілай паставілі перад КП(б)Б гэтую праблему.

Партыя ў значнай ступені ачысьцілася ад тых элемэнтаў, якія арасьліся з варожымі элемэнтамі, ад элемэнтаў, якія разьлажыліся. Але, таварышы, нельга лічыць, што ў нас па сёньняшні дзень такое становішча, што ў Наркамземе, Наркамасьвеце, дасьледчых установах, у Акадэміі Навук і ва ўсіх нашых установах і арганізацыях мы ачысьціліся канчаткова ад гэтых элемэнтаў. Гэтыя элемэнты ёсьць, і мы кожны дзень у рабоце гэта адчуваем. Тым больш стаіць востра праблема кадраў і іменна пралетарскіх кадраў.

Я, таварышы, бяру некаторыя лічбы аб нашых патрэбах. Калі ўзяць тое, што нам патрэбна ў пяцігодку, дык атрымліваецца наступны малюнак: па спэцыялістых з вышэйшай асьветай нам патрэбна 12,5 тыс., будзе выпушчана каля 5.000. Па спэцыялістых з сярэдняй асьветай—26.000, будзе выпушчана 14,5 тыс. Інжынэрна-тэхнічных сіл усіх галін народнай гаспадаркі—да 4.000 патрэбна, будзе выпушчана звыш 600 чал. Выразна кідаецца ў вочы колькасны недахоп у кадрах для абслугоўваньня

Выл

XIII зьезд КП(б)Б

Арганізацыйная справаздача ЦК КП(б)Б

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б т. Васілевіча*)

Становішча на вёсцы

Ёсьць звыш 1.000 сельсаветаў, вясковых ячэек каля 1.000, калгасаў на сёньнішні дзень маецца звыш 3.000, а калгасных ячэек усяго 487. Што датычыць калгасаў, дык становішча некалькі лепшае: за апошні год нашы пазыцыі ў калгасах узмацніліся. Гэта відаць з таго, што ў мінулым годзе ў нас была ўсяго 51 саўгасная ячэйка, а ў гэтым годзе 131. З колькасьці саўгасных і калгасных ячэек відаць, што вясковыя парт-арганізацыі зрабілі значны крок у галіне перабудовы сваёй работы і прыстасаваньня яе да сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі.

У галіне калгаснага ўзмацненьня вясковай партарганізацыі і ўзмацненьня камуністычнай праслойкі сярод батрацтва і беднаты становішча такое: на 1/I 1929 году батракоў і сельска-гаспадарчых рабочых было 843, на 1/IV 1930 году—1.536. Процант вялікі, але процант абхопу батракоў абсалютна нездавальняючы. Трэба сказаць, што камуністычная праслойка на вёсцы вымяраецца дзесятымі долямі аднаго процанту тэй колькасьці батракоў, сельска-гаспадарчых рабочых, беднякоў і калгаснікаў, якія ёсьць на вёсцы. Я думаю, што нам тут трэба цалкам зыходзіць з характарыстыкі, якую даў тав. Кагановіч, характарызуючы работу партарганізацыі на вёсцы наступным чынам: «Калі востра і рэзка фармуляваць, дык па сутнасьці справы мы павінны на вёсцы пабудаваць партыйную арганізацыю, дольную кіраваць вялізарнейшым рухам калектывізацыі, здольную арганізоўваць беднату і батрацтва, у іх змаганьні з кулаком, у іх кіраўніцтве сераднякам, здольную кіраваць ажыцьцяўленьнем вялікага гістарычнага новага лёзунгу партыі—лёзунгу ліквідацыі кулацтва, як класу».

З усёй вострасьцю стаіць пытаньне аб узмацненьні вясковай партыйнай арганізацыі шляхам значнага і рашучага ўзмацненьня пралетарскімі элементамі. Задачы, якія стаіць зараз перад вясковымі арганізацыямі, зробяцца непарауўнаўча мацнейшымі, чым яны маюцца на сёньнішні дзень.

У зьвязку са становішчам вясковых партыйных арганізацый я, таварышы, спынюся на адным пытаньні, якое закрануті на Менскай акруговай партыйнай канфэрэнцыі. У выступленьнях на Менскай акруговай партыйнай канфэрэнцыі таварышы таварылі аб маім выступленьні на пленуме ЦК камсамолу Беларусі. Гэта было ў красавіку бягучага году. Гаворачы аб становішчы вясковай арганізацыі і аб задачах, якія стаяць перад ёю, я спынуўся на тым, якое становішча мы маем у рабоце з беднатой і сказаў наступнае, што работа з беднатой дрэнна стаіць і таму, між іншым, што некаторыя члены партыі—сераднякі, якія знаходзяцца ў партыі і маюць сваю гаспадарку, ня могуць весьці работы з беднатой. Такая фармулёўка была няправільная, таму што, прыводзячы прыклад з серадняком, трэба было падкрэсьліць, што гутарка ідзе аб асобных серадняках, якія знаходзяцца ў партыі і маюць гаспадарку заможна-серадняцкую. Гутарка ідзе аб такім серадняку-камуністым, які заражаны дробна-буржуазнай псыхалёгіяй, які зьвязан са сваёй індывідуальнай гаспадаркай моцна і не жадае ісьці ў калгас. На другі дзень пасьля выступленьня на пленуме ЦК камсамолу, я выступіў і гэту фармулёўку паправіў у такім сэнсе, як зараз кажу.

Я лічу правільным, што з боку нашых арганізацый—гэта паказвае на выключную актыўнасьць арганізацыі, гэта паказвае на чуласьць арганізацыі і гэта якраз у добрым сэнсе характарызуе становішча ў нашай арганізацыі,—паасобныя памылковыя фармулёўкі, хто-б іх не даваў, сустракаюць крытычныя адносіны.

Таварышы, кажучы аб далейшым росьце вясковай партыйнай арганізацыі, нам трэба выходзіць з наступных слоў тав. Сталіна:

«Само сабой зразумела, што ўзрост партыйных радоў у калгасах будзе ісьці больш або менш шпаркімі тэмпамі. Пажадана, каб усе найбольш згуртаваныя ў барацьбе з кулацтвам элементы калгаснага руху, асабліва батракоў і беднякоў, знайшлі прыстасаваньне сваіх сіл у радох партыі. Пры гэтым зразумела, што індывідуальны падыход, індывідуальны прыём у партыю павінен тут ужывацца з асаблівай настойлівасьцю. Побач з замацаваньнем пралетарскага асяродку ў нашай партыі, побач з павялічэньнем удзельнае вагі пралетарскіх элементаў у вясковых партарганізацыях, неабходным элементам узмацненьня нашай партыі зьяўляецца самаачысткa яе ад ідэалёгічна нявытрыманых разлажыўшыхся элементаў».

У гэтым годзе працэс самаачысткі дапаўняецца працэсам чысткі партыі. Чыстка паказала, што наша партыя зьяўляецца арганізмам здаровым. Падрабязна пра чыстку будзе гаварыць у сваім дакладзе тав. Калнін.

Самакрытыка і ўнутрыпартыйная дэмакратыя за апошнія паўтара гады ўнутры партыі значна ўзмацніліся, кантроль членаў партыі над работай партарганізацый у першую чаргу, над палітычнай лініяй партарганізацый, значна ўзмацніўся. У гэтым годзе мы маем вельмі многа фактаў праяўленьня ініцыятывы з боку членаў партыі ў галіне барацьбы з права-апартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі, з «левымі» загібамі. Узмацненьне самакрытыкі не магло не адбіцца на ўзмацненьні ўнутрыпартыйнай дэмакратыі. Я павінен падкрэсьліць, што ў некаторых мясцох, дзе праходзілі перавыбары ячэек і райкомаў (праўда, гэта асобныя выпадкі) былі дапушчаны памылкі ў тым сэнсе, што ня ўтрымалі ў сваіх руках цьвёрдае забесьпячэньне пралетарскага ядра ў партыйным кіраўніцтве. Самакрытыка, унутрыпартыйная дэмакратыя мяркуе цьвёрдую лінію на забесьпячэньне пралетарскага асяродку ў партыйных арганізацыях, у выбарчых органах партыі. Ні ў якім разе нельга разумець так, што самакрытыка і дэмакратыя можа меркаваць памяншэньне пралетарскага асяродку.

На вялікі жаль, у некаторых мясцох такія факты мелі месца, калі недастатковае кіраўніцтва ў тым, каб забясьпечыць пралетарскі асяродак у партыйных камітэтах прывяло да таго, што пралетарскі асяродак зьменшыўся ў параўнаньні з мінулым годам. Тое-ж самае наглядаецца на некаторых канфэрэнцыях. Яшчэ капчатковых вестак няма, але я ведаю, што ў прыватнасьці на Віцебскай канфэрэнцыі процант рабочых ад варштату быў меншы, чымся ў мінулым годзе.

Гэтыя зьявішчы прымушаюць нас задумацца над тым, што нам неабходна ўзмацніць кіраўніцтва (гэта ніяк не суперэчыць самакрытыцы і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі) павялічэньнем пралетарскага асяродку ў партыйных камітэтах, на партыйных канфэрэнцыях.

Камсамол

Камсамольская арганізацыя на 1-ае красавіка 1930 году выглядае так: на ас кастрычніка 1929 году было 77.500, на 1-ае красавіка 1930 году—85.152. Па сацыяльным складзе: рабочых маецца зараз—32 проц., батракоў—10, беднякоў—37, сераднякоў—11, саматужнікаў—3 і іншых—4.

Важна прасачыць, як выконваецца дырэктыва аб 100 проц. ахопе рабочай і батрацкай моладзі. Мы маем лічбы на некаторых прадпрыемствах: фабрыка «Дзьвіна» ў Віцебску—50 проц., вагонная майстэрні ў Гомелі—66 проц., «Бярэзіна»—34, нанчошная фабрыка ў Віцебску—53, «Гэрой Працы» ў Гомелі—54. Пастанова аб 100 проц. ахопе рабочай і батрацкай моладзі ня выконваецца і гэта адбіваецца на сацыяльным становішчы камсамольскіх арганізацый.

Камсамольская арганізацыя, як і ўся партыя, мае вялікія дасягненьні за гэты справаздачны пэрыяд, але ў камсамольскай арганізацыі была значная колькасьць прарываў, асабліва ў справе калектывізацыі і раскулачваньня. Гэтыя прарывы паказваюць, наколькі патрэбна ўзмацненьне пралетарскага асяродку ў камсамольскіх арганізацыях, наколькі патрэбна палепшыць партклёраўніцтва камсамолам.

Рост камсамольскай арганізацыі з кастрычніка 1929 году наступны: з 1 кастрычніка 1929 г. па 1-ае студзеня 1930 году рост 5.383, з 1-га студзеня да 1-га красавіка 1930 г.—6.009. Рост ідзе за лік рабочых—31 проц., батракоў—16 проц., беднякоў—38, сераднякоў—10, саматужнікаў—1,5 і іншых—1,3 проц. І тут наглядаецца недастатковае ўцягненьне ў партыю і невыкананьне дырэктывы аб уцягненьні ў партыю на 100 проц. рабочай, батрацкай і бядняцкай моладзі. Камсамол за гэты справаздачны пэрыяд зьяўляўся энэргічным, рашучым і баявым дапаможнікам партыі. Становішча камсамольскіх арганізацый, у выніку абсьледваньня ЦК УсеЛКСМ, у выніку адпаведнай пастановы студзеньскага пленуму ЦК, паказваюць шмат і шмат недахопаў, памылак, палітычных скажэньняў лініі. Гэтыя прарывы на камсамольскай арганізацыі падрабязна характарызаваны пастановамі студзеньскага пленуму, я на іх спыняцца ня буду. Я хачу спыніцца на другім пытаньні, на пытаньні партыйнага кіраўніцтва ЛКСМ. Я думаю, што адным са слабых вучасткаў самакрытыкі зьяўляецца самакрытыка праверкі партыйнага кіраўніцтва, асабліва важнымі галінамі нашай унутрыпартыйнай работы, у прыватнасьці нашага кіраўніцтва камсамолам.

Я не бяру рад фактаў, якія адмоўна характарызуюць працу партыйнага асяродку ў камсамоле, асноўным сёньня зьяўляецца другое—асноўным зьяўляецца тое, што мы маем вялікія недахопы ў партыйным кіраўніцтве камсамолам.

Гэтыя недахопы ў асноўным зводзяцца да двух. Першае, маецца ў паасобных зьвяньнях нашай арганізацыі недаацэнка палітычнай і эканамічнай ролі моладзі ў сацыялістычным будаўніцтве. Мне здаецца, што мы не заўсёды вядзем, ва ўсякім разе не вялі рашучага змаганьня з паасобнымі настроікамі недаацэнкі палітычнага і эканамічнага значэньня моладзі ў сацыялістычным будаўніцтве. Другое, можна фармуляваць як недаацэнку ролі камсамолу, як палітычнай арганізацыі, якая пад кіраўніцтвам партыі ахапляе працоўную моладзь і ўключае гэтую апошнюю ў рады барацьбітоў за сацыялістычнае будаўніцтва.

Зразумела, нельга сказаць, каб гэтыя два зьявішчы былі занадта пашраны ў арганізацыі, каб арганізацыя была заражана імі. Гэтага, зразумела, няма. Але ў паасобных зьвеньнях арганізацыі такія зьявішчы мелі месца і рашучае змаганьне з гэткімі зьявішчамі не вялося. Я думаю, што трэба паставіць больш рашуча пад агонь самакрытыкі практыку нарыйнага кіраўніцтва ўсімі арганізацыямі, усімі элементамі ўнутрыпартыйнай працы. Трэба больш рашуча вмагацца з недаацэнкай ролі моладзі ў сацыялістычным будаўніцтве, змагацца з недаацэнкаю ролі камсамолу, як палітычнай арганізацыі, працуючай пад непасрэдным кіраўніцтвам партыі.

Аб павышэньні тэарытычнага ўзроўню партыйных кадраў

Ленін казаў: «без рэвалюцыйнай тэорыі ня можа быць і рэвалюцыйнага руху». «Ролю перадавога барацьбіта можа весьці толькі партыя кіруючай перадавой тэорыяй». А вось, таварышы, наконт тэарытычных ведаў, наконт партыйнай вучобы, наконт таго, каб падкавацца, прыступаючы да вырашэньня важнейшых задач, хаця-б пастановамі партыі, пачытаць Леніна,—тут справа вельмі і вельмі дрэнна. Гэта трэба прызнаць адкрыта. Думаю, што маюць месца яшчэ і такія выпадкі, калі некаторыя, прачытаўшы праграму партыі, ужо і забыліся пра яе. Часта гэта не залежыць ад добрай ці злой волі паасобных камуністых, часта ўмовы працы, абставіны працы стварацца такія, калі партыйцаў пагружаюць з галавою і яны ня маюць магчымасьці займацца над сабой. Трэба замяніць мэтады самаадукацыі, трэба даць магчымасьць, каб кожны партыец мог над сабой працаваць. Трэба будзе актыву (паступова павышаючы гэты круг) раз ці два разы ў год даваць магчымасьць адпаведны час прапрацаваць над сабой, каб падкавацца, калі яго ня можна адпусьціць на сталую вучобу. Без таго, каб стварыць спэцыяльныя ўмовы для адукацыі і самаадукацыі, бяз гэтага немагчыма будзе вырашыць пытаньне аб павышэньні тэарытычнага ўзроўню і тэарытычнай падкоўкі нашай арганізацыі.

Мы тут спатыкаемся ў некаторых мясцох яшчэ з недаацэнкамі в несур'ёзнымі адносінамі да тэарытычнай вучобы. Гэта недаацэнка таксама не зьяўляецца пашыраным зьявішчам, якое было-б на ўсіх арганізацыях, але такія настроікі маюцца, калі недаацэньваць у прыватнасьці таго, што неабходнасьць стварэньня адпаведных умоў для вучобы — гэта адзін з важнейшых элементаў, ад якіх залежыць сама вучоба.

***

Таварышы, мы павінны адкрыта прызнаць, што з рэарганізацыяй партклёраўніцтва на прадпрыемствах, у райкомах, акруговах і ў ЦК у нас справа ўсё яшчэ не адладжана. Мы рэарганізавалі нашы аддзелы ў сэктары. Мэта ясная: зрабіць кіраўніцтва больш выразным, палепшыць якасьць кіраўніцтва, даць большыя тэмпы, рацыяналізаваўшы працу. Але ёсьць выпадкі як у прафсаюзах, так і ў партыйным апараце, калі зьмянілі толькі шыльду: замест аддзелаў напісалі — сэктары. Трэба і на гэтым пытаньні завастрыць увагу, завастрыць дзеля таго, каб мы па-сапраўднаму зьмянілі мэтады і формы працы, каб сапраўды палепшыць якасьць кіраўніцтва. Пытаньне аб арганізацыі добраахвотніцтва ў партыйнай працы вырашаецца нездавальняюча. Добраахвотніцтва яшчэ не прыняло такога характару, каб мы маглі гэты сродак выкарыстаць для большай актывізацыі партыйнай масы, для паляпшэньня працы нашых апаратаў. Дрэннае кіраўніцтва камсамолам, беднатой, тэарытычнай вучобай, нездавальняючае становішча і вынікі рэарганізацыі працы на прадпрыемствах, мы маем і таму, што мы ня здолелі мабілізаваць партыйную масу, як гэта трэба было. Мне здаецца, што іменна тут трэба шукаць караньні ўсіх недахопаў па гэтай галіне. Мы маем значна і непараўнальна большую актыўнасьць, чым раней, але ў нас ня маецца дастатковай мабілізацыі. Вялізарнейшай задачай зараз зьяўляецца ўзмацненьне актыўнасьці кожнага члена партыі як ва ўнутрыпартыйнай працы, так і ў працы сярод беспартыйных. Кожны камуністы павінен быць арганізатарам і кіраўніком пэўным вучасткам унутрыпартыйнай працы, арганізатарам і кіраўніком мас. Значыць, задача правільнага разьмеркаваньня сіл і нагрузкі кожнага камуністага зьяўляецца важнейшай задачай.

Дзеля таго, каб мы маглі вырашыць усе задачы, што стаяць перад намі, нам трэба ўзьняць якасьць партыйнага кіраўніцтва. Аб гэтым лепш за ўсё сказаць словамі тав. Сталіна: «каб узьняць партыйнае кіраўніцтва на адпаведную вышыню, трэба ўзьняць перш за ўсё кваліфікацыю партыйных работнікаў. Цяпер якасьць працаўніка павінна стаяць на першым месцы, але падняць якасьць партыйнага працаўніка адным узмахам не так-та лёгка. Старыя навыкі тарапліва адміністраваньня, замяншчыя, на жаль, знаньне справы, ўсе яшчэ жывы ў партыйных арганізацыях. Гэтым, уласна, і тлумачыцца тое, што так званае партыйнае кіраўніцтва выраджаецца іншы раз ў сьмешнае награмаджэньне нікому непатрэбных распараджэньняў і пустое і славеснае кіраўніцтва, нічога і нікога не закранаючае. У гэтым адна з сур'ёзнейшых небясьпек паслабленьня і зьніжэньня партыйнага кіраўніцтва».

Трэба спыніць штэмпэляваньне, трэба дабіцца выразнага кіраўніцтва, трэба сканцэнтраваць увагу на вырашэньні асноўных задач. Задачу паляпшэньня якасьці кіраўніцтва можна вырашыць мабілізаваўшы масы на крытыку і самакрытыку працы партыйных арганізацый і партыйнага кіраўніцтва.

Таксама задача падбору кадраў, у першую чаргу пралетарскіх, і праверка выкананьня рашэньняў зьяўляецца важнейшай задачай.

Падводзячы вынік, трэба сказаць, што за апошнія 15 месяцаў мы зрабілі вялізарную работу ў галіне перабудовы нашых арганізацый, у галіне прыстасаваньня іх да новых умоў работы. Асноўны вывад, які трэба зрабіць з практыкі і аналізу работы заключаецца ў тым, што сёньня зноў з асаблівай сілай стаіць пытаньне аб паляпшэньні кіраўніцтва працоўнымі масамі, сацыялістычным будаўніцтвам. Тав. Сталін на гэтыя пытаньні гаворыць наступнае: «што значыць кіраваць? Калі палітыка партыі правільна, і правільныя адносіны паміж авангардам і клясай не парушаюцца, кіраваць у такіх умовах значыць — умець пераконваць масы ў правільнасьці, палітыкі партыі, высоўваць і праводзіць такія лёзунгі, якія падводзяць масы да пазыцый партыі і палягчаюць ім распазнаць на сваёй уласнай практыцы правільнасьць палітыкі партыі. Уздымаць масы па ўзроўні сьвядомасьці партыі і забясьпечыць, такім чынам, падтрыманьне мас і іх гатоўнасьць да рашучай барацьбы».

Уся праца нашых масавых арганізацый пераконвае нас у тым, што нам трэба ва ўвесь рост і надалей вырашаць задачу — не цягнуцца ў хвасьце мас, не забягаць наперад, а разам з масамі ісьці наперад па выкананьні ўсіх плянаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Для таго, каб гэтага дабіцца наша партыя павінна весьці непрымірымую барацьбу на два франты — з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, і з «левым» ухілам і прымірэнцтвам да іх. Агонь барацьбы павінен быць накіраваны на правы ўхіл, правая небясьпека застаецца галоўнай небясьпекай.

Таварышы, мы прышлі да XIII зьезду пасьля вялізарнай работы, праробленай Цэнтральным Камітэтам усёй КП(б)Б ва ўмовах абвастранай клясавай барацьбы, ва ўмовах бурных тэмпаў сацыялістычнай індустрыялізацыі краю, ва ўмовах сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Мы ў гэтай працы маем вялізарныя дасягненьні. Але ў нас меліся і памылкі, мы іх своячасова выправілі, прызналі, імкнуліся арыентаваць арганізацыю моцна, па-бальшавіцку, на прызнаньне дапушчаных памылак, на выпраўленьне дапушчаных памылак. Мы прышлі да XIII зьезду арганізацыяй згуртаванай, арганізацыяй бальшавіцкай больш загартаванай.

Усё гэта гаворыць аб тым, што КП(б)Б, якая працуе на фарпосьце Савецкага Саюзу, зьяўляецца згуртаванай, бальшавіцкай арганізацыяй з моцнай апорай, баявым бальшавіцкім атрадам ЦК УсеКП(б).

СПРЭЧКІ па СПРАВАЗДАЧЫ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ КП(б)Б

Прамова тав. Чычэрава

Таварышы! Посьпехі гаспадарчага і калгаснага будаўніцтва ў Беларусі, рашучая барацьба ЦК КП(б)Б з правым апартунізмам, як з аспоўнай небясьпекай на даным этапе, барацьба з «левымі» загібамі—гавораць за тое, што палітычная лінія была правільнай, а практычная работа зьяўлялася практычным ажыцьцяўленьнем генэральнай лініі нашай партыі.

Разам з тым мы мелі ў асобных арганізацыях нашай партыі і ў самога ЦК КП(б)Б рад асобных памылак. 18 красавіка пастановай бюро ЦК прызнала гэтыя памылкі і рашуча, па-бальшавіцку стала на шлях іх выпраўленьня і дапамогі мясцовым арганізацыям.

Ня гледзячы на тое, што ЦК партыі на справе па-бальшавіцку ўзяўся за выпраўленьне недахопаў, якія былі ў нашай практычнай рабоце, ня гледзячы па рад фактаў, якія ясна пацьвярджаюць правільнасьць палітычнай лініі ЦК КП(б)Б, рад таварышоў выступаюць з яўна няправільным абвінавачаньнем, ударачы па асобных кіраўніках і ў канчатковым разрахунку абгаўльваючы ўсё гэта, робяць вылазку абвінавачаніць у няправільнай пастаноўцы пытаньня выкананьня раду палітычных задач ЦК партыі.

Таварышы, мне думаецца, што выступленьне т. Араніштама, на якое некаторыя таварышы ўказваюць, як на няправільнае, у першай частцы зусім відавочна пацьвярджаецца радам выступленьняў.

Дазвольце гэта даводзіць. Хіба, таварышы, нашы партыйныя арганізацыі на мясцох ня мелі практычных памылак. Возьмем, напрыклад, перагібы на зачыненьні цэркваў. Мы, напрыклад, па Віцебскай акрузе мелі 120 цэркваў, а незакрытымі засталіся толькі дзьве. Ска жэце, хіба Цэнтральны Камітэт нам гэта рэкамэндаваў. Чаму-ж мы сваіх памылак не жадаем выправіць. Тыя выступленьні, якія тут мелі месца а боку асобных таварышоў, выступленьні бяспрынцыпныя, сьведчаць аб тым, што ў нас яшчэ шмат упорствуючых, не жадаючых прызнаць свае памылкі. Наглядзім, як складваецца гэта гісторыя: выступленьні т. т. Смаля, Штэймана і інш.

І было-б, вядома, няправільна, калі-б мы на такія выступленьні не адказвалі. Няправільна было-б не адказваць, у прыватнасьці, на выступленьне т. Штэймана. Чым гэта выступленьне пахне? Гэта пахне сапраўдным яўрэйскім шавінізмам. І калі мы шмат увагі аддаем рашучай барацьбе з нацыянал-дэмакратызмам (што, вядома, зусім правільна, дык нам таксама трэба удзяліць дастатковую ўвагу барацьбе і з вялікадзяржаўным шавінізмам, які ў асобных партыйных арганізацыях мае даволі салідныя карэньні, а таксама трэба паставіць пытаньне аб рашучай барацьбе з праявамі і яўрэйскага шавінізму. Выступленьне т. Штэймана зьяўляецца іменна яркім адбіткам наяўнасьці гэтых настроіў.

Я хацеў-бы закрануць адно надзвычай важнае гаспадарчае пытаньне. Мы ня выканалі прамфінпляну па ўсёй Беларусі. У нас ня зусім добра зараз праходзіць сэўба. Цэлы рад гаспадарчых пытаньняў зараз не атрымаў дастатковага вырашэньня. Мы мелі цэлы рад памылак, якія да гэтых часоў яшчэ не ў дастатковай ступені выпраўлены. Мы маем такое становішча, калі на мясцох ёсьць яшчэ вялікая праслойка людзей, якія ўпарта не жадаюць выпраўляць сваіх памылак; рад асобных таварышоў Беларусі ўсё яшчэ настойчае на тых памылках, якія яны зрабілі ў сваёй практычнай рабоце. Выступленьні тав. з Ворпы і раду іншых таварышоў гавораць аб нежаданьні стаць на шлях рашучага выпраўленьня памылак; тое, што гэтае нежаданьне ёсьць у значнай часткі актыву—гэта факт. Мне думаецца, што правільна т. Ягораў паставіў пытаньне аб эканамічным раўнаваньні Беларусі. Мы зараз маем такое становішча, напрыклад, у Віцебску. Віцебск зьяўляецца акругай у значнай частцы ільнаводнай. У Віцебскай акрузе ёсьць асобныя буйныя ільнаводныя раёны, на прыклад, Лёзна, зьяўляецца буйнейшым ільнаводным раёнам, і ён мае ўсяго толькі адзін трактар. Магілёўская акруга, Шклоў, буйнейшы ільнаводны раён, ня мае ніводнага трактара. Калінінскі раён, не ільнаводны, які ня мае вялікага эканамічнага значэньня, мае 38 трактараў. Зразумела, што гэта абсалютна не адпавядае тэй пастаноўцы, якую яно высоўвае ў нашай практычнай рабоце па ўзьяднаньні сельскай гаспадаркі. Калі такое распаўсюджаньне было зроблена на аснове памылак, дык зараз у практычнай рабоце гэта павінна быць выпраўлена.

Мы таксама маем такое становішча з каапэрацыяй. Каапэрацыя не займае на лежнага месца ў нашай рабоце. Гэтае пытаньне ў рабоце зьезду павінна атрымаць належнае асьвятленьне.

Прамова тав. Акстолкера

На працягу двух дзён вельмі многія таварышы спынуліся на тых дасягненьнях, якія мы можам сёньня падагуліць, спусьціўшы паўтара гады пасьля XII зьезду КП(б)Б. Але асобныя таварышы тут таварылі аб дасягненьнях і побач з гэтым нападалі на Цэнтральны Камітэт, на тав. Васілевіча. Нельга-ж тут усё-ж аддаяць сакратара Цэнтральнага Камітэту, які на працягу 6 месяцаў быў першым сакратаром нашай партыі. Тав. Васілевіч прыблізна 6 месяцаў стаяў на чале Цэнтральнага Камітэту і работа праводзілася непасрэдна над яго кіраўніцтвам. Мы не зазначалі, што калі тав. Васілевіч стаяў на чале Цэнтральнага Камітэту партыі, у яго былі такія памылкі. Ніхто аб гэтым, ні адзін з таварышоў, якія ўспаміналі аб гэтых памылках, што зрабіў т. Васілевіч, ніхто ні слова не сказаў, што гэтыя памылкі былі зроблены тады, калі ён стаяў на чале Цэнтральнага Камітэту нашай партыі.

Мы павінны разглядаць усялякую крытыку так ці дае яна карысьць партыі. Сёньня прыводзіць усе гэтыя старыя вытрымкі, якія можна знайсьці па любога з нас, прыводзіць іх і рабіць з гэтага цэлую сыстэму, ці дасьць гэта карысьць нашай партыі? Мы на сёньнішні дзень павінны рабіць тое, што прыносіць карысьць нашай партыі. Калі мы крытыкуем тав. Чарвякова, дык гэта мы робім для таго, каб прынесьці карысьць нашай партыі, таму што ў яго ёсьць цэлая сыстэма памылак. А ці ёсьць цэлая сыстэма памылак у т. Васілевіча? Не. У асобных яго выступленьнях прасьлізгваюць асобныя няправільныя словы пры правільнай палітычнай лініі тав. Васілевіча. А асобныя таварышы хочуць зрабіць з гэтага сыстэму, што зьяўляецца няправільным.

Возьмем выступленьне тав. Штэймана. Ня гледзячы на тое, што ён даў спраўку, усё-ж яна ніяк ня можа нас задаволіць.

Нам трэба так біць, каб ён больш так не выступаў. Калі тав. Славінскі гаварыў, што гэта ў трэці раз, дык нам трэба гэта ўлічыць. Тав. Штэйман быў членам бюро акругкому, зьяўляецца членам акругкому і быў членам яўбюро ЦК. І калі тав. Штэйман выступае і гэтым самым паглыбляе тыя памылкі, якія былі ў Яўбюро ЦК, то гэта непасрэдна зьвязана з ранейшым — тая палітыка, якую праводзіла Яўбюро, і тое выступленьне, якое мы тут мелі.

Многія з нас памятаюць выступленьне тав. Гамарніка на верасьнёўскім пленуме нашай партыі, калі ён гаварыў: «чаму-ж гэта ў нас так атрымалася, што мы мелі столькі недахопаў у нашых асобных савецкіх установах». Ён тлумачыў гэта тым, што вельмі многа мы давараем асобным адказным партыйным работнікам, што мы часта займаемся штэмпэляваньнем. У пастанове нарады сакратароў калгасных ячэек мы маем там такую-ж памылку. А мы займаліся тым, што праштэмпэлявалі гэту пастанову ў адносінах да калектывізацыі.

Прамова тав. Зільбэра

Я хачу спыніцца на пытаньні разьвіцьця нашай прамысловасьці, якая ня толькі працуе на мясцовым сырцы, але таксама і на рыначным.

Паводле статыстыкі, у нас ёсьць 5 мільёнаў насельніцтва, а рабочых у цэнзавай прамысловасьці—52 тыс. Гэктага, вядома, мала. Мы павінны ставіць пытаньне аб павялічэньні ўдзельнай вагі нашай прамысловасьці.

У нас быў распрацоваан праект пабудовы швэйнай фабрыкі на 10-11 тыс. рабочых. Мы, аднак, ня ведаем, да гэтых часоў, у якой стадыі знаходзіцца выраш-ньне гэтага пытаньня. Я зараз ня ўзьнімаю пытаньня аб тым, у якім іменна месцы трэба будаваць гэту фабрыку, але трэба канчаткова вырашыць пытаньне аб самой пабудове яе.

Калі мы гаворым аб скарыстаньні і пашырэньні прамысловасьці на мясцовай сырцовай базе, дык мы ў той-жа час ні ў якім выпадку ня можам аслабіць пытаньня аб пашырэньні прамысловасьці, якая працуе на прывозным сырцы.

Мы ў сучасны момант будуем у Віцебску новую швэйную фабрыку. Корпус ужо будзе хутка гатовы, але вялікія сумненьні выклікае пытаньне са своячасовым абсталяваньнем фабрыкі. Мне здаецца, што тут гэты момант трэба ўлічыць у сэнсе своячасовай дастаўкі неабходна абсталяваньня.

Наступнае пытаньне аб інфармаваньні нарыйнай масы аб пастановах нашага Цэнтральнага Камітэту і аб дачы правільных арыентовак на тых ці іншых момантах. Я памятаю, адзін час Цэнтральны Камітэт практыкаваў рассылку палітлістоў, якія абгаворваліся на нашых калектывах, там мы выносілі нашы дадаткі, абмеркоўваліся думкамі і г. д. Аднак, гэтых палітлістоў мы зараз не атрымліваем.

Гэтае пытаньне я хачу зьвязаць з пытаньнем адносна прадстаўніцтва рабочых у нашых акруговых і цэнтральных арганізацыях. Я павінен агаварыцца, мы лічым, што нашы кіруючыя органы знаходзяцца ў надзейных палітычных руках і вядуць работу па правільным бальшавіцкім ленінскім шляху, у гэтым мы не сумняваемся. Але калі мы гаворам аб увядзеньні прадстаўнікоў рабочых у тыя ці іншыя партыйныя арганізацыі, прадстаўнікоў ад данай фабрыкі або заводу, мы павінны заўсёды ўлічваць і ўзважваць, ці зможам мы атрымаць адпаведную арыентоўку ад данага таварыша, высунутага ў цэнтральныя або акруговыя арганізацыі.

Некалькі слоў адносна партыйнай нагрузкі. У мяне ёсьць каляндарнае расьпісаньне і выходзіць, што няма ніводнага дня, каб партыец на быў заняты тэй ці іншай нагрузкай на працягу ўсяго месяца. Я думаю, што тут трэба ўстанавіць некаторы рэгламант, каб рабочы партыец пасьля рабочага дня мог мець некаторы час для таго, каб падрыхтаваць сябе, каб папоўніць свой тэарытычны багаж. Мы ведаем, што ў некаторых выпадках партыйцы ў сэнсе сваёй тэарытычнай падрыхтоўкі часам адстаюць ад палітычнага жыцьця, якое разьвіваецца хуткімі тэмпамі. Гэта тлумачыцца тымі нагрузкамі, які мае кожны з партыйцаў і якія не дазваляюць яму аддаць пэўны час самападрыхтоўцы.

Апошняе пытаньне аб кадрах. У нас часта бывае, калі мы гаворым аб рабочых кадрах, што мы вярбуем гэтыя кадры з тых рабочых праслоек, якія ня маюць дастатковага вытворчага стажу і адтуль пасылаем у навучальныя ўстановы і на спэцыяльныя курсы. Думаю, што на гэта таксама трэба зьвярнуць адпаведную ўвагу. Рабочыя кадры навінны вербавацца з тых пластоў, якія маюць ужо дастатковы вытворчы стаж, якія маюць ужо адпаведныя працоўныя пралетарскія навыкі.

Прамова тав. Супруна

Тут ужо многія таварышы далі станоўчую ацэнку ўсёй рабоце Цэнтральнага Камітэту. Я з гэтай ацэнкай згодзен і паўтарацца ня буду. Цэнтральны Камітэт партыі і ўся партыя вялі і вядуць барацьбу з правым апартунізмам, як з галоўнай небясьпекай на даным этапе. Мы маем яшчэ і зараз спробы правых апартуністых выступаць нават на акруговых партыйных канфэрэнцыях, з імкненьнем давесьці, што ўсе тыя скажэньні, ўсе тыя найгыбейшыя памылкі, якія былі дапушчаны ў розных мясцох у справе калектывізацыі, быццам вынікаюць з памылак Цэнтральнага Камітэту партыі. Гэтым выпадкам правых апартуністых партыйныя арганізацыі даюць рашучы адпор. Нам трэба даць канчатковы і рашучы бой правым апартуністым. Правыя апартуністы ніколі зараз не выступаюць проста супроць лініі партыі, а яны знаходзяць розныя лазейкі з тым, каб зрабіць напад на лінію партыі. Тав. Гей у сваім дакладзе спыніўся на ваеннай падрыхтоўцы і на рабоце Цэнтральнага Камітэту ў адносінах падрыхтоўкі насельніцтва да абароны. Ён дастаткова спыніўся на гэтых пытаньнях, і я лічу, што Цэнтральным Камітэтам тут шмат прароблена.

Аднак, на мясцох важнейшым пытаньням, як пытаньні падрыхтоўкі да абароны, якія нельга вырашыць толькі Асоавіяхіму, партарганізацыі не ўдзяляюць увагі. У нашых умовах, ва ўмовах Беларусі я лічу, што гэтыя пытаньні заслугоўваюць вялізарнейшай увагі з боку Цэнтральнага Камітэту і ўсіх партыйных арганізацый.

Я лічу, што ЦК КП(б)В павінен рашуча паставіць пытаньне перад ЦК УсеКП(б) аб жыцьлёвым будаўніцтве для ваенных часьцей.

Прамова тав. Вайнэра

Палітычная і арганізацыйная лінія ЦК Кампартыі Беларусі была правільная, яна цалкам і поўнасьцю вынікала з генэральнай лініі партыі.

Тав. Гей у сваім справаздачным дакладзе з дастатковай выразнасьцю і яснасьцю гаварыў аб памылках ЦК КП(б)В. Дакладчыкі ЦК КП(б)В на акруговых партыйных канфэрэнцыях гаварылі — гэта памылкі ў практычнай рабоце, якія былі дапушчаны ў справе калгаснага будаўніцтва. Мне думаецца, што вялікім недахопам трэба лічыць тое, што выступаўшыя таварышы на працягу двух дзён вельмі мала гаварылі адносна таго, як выконваюцца пастановы ЦК партыі па выпраўленьні перагібаў і памылак, якія былі дапушчаны ў калгасным будаўніцтве. Трэба проста сказаць, што ЦК партыі Беларусі зусім выразна і ясна прызнаў свае асобныя памылкі ў гэтай часьці работы, даў пасьля гэтага сваячасовыя указаньні наконт самай рашучай барацьбы з гэтымі перагібамі і памылкамі. Ці можам мы сказаць, што на мясцох мы зараз усюды маем рашучае бальшавіцкае выпраўленьне перагібаў і памылак. Я павінен сказаць, што калі мы маем у асноўным і цэлым пералом у бок рашучага выпраўленьня гэтых памылак, дык побач з гэтым мы маем факты, калі ў некаторых мясцох гэтыя памылкі не прызнаюцца па-бальшавіку, калі маецца спроба замазваць, ня прызнаць гэтыя памылкі. На Віцебскай акруговай партканфэрэнцыі выступалі асобныя таварышы з раёнаў і гаварылі, што мы ў асобных выпадках зараз маем працягваньне з боку пізаных партыйных арганізацый гэтых памылак. Нам трэба рашуча ўдарыць па гэтым месцы, трэба па-бальшавіцку паставіць кропку над гэтым пытаньнем і прымусіць тых, якія не прызнаюць, замазваюць гэтыя памылкі, — прызнаць гэтыя памылкі і самым рашучым чынам пайсьці на шляху іх выпраўленьня.

Крытыкуюць пам

ЗА ПРАЛЕТАРСКІЯ КАДРЫ

Выканальне дырэктыў партыі аб перабудове форм і мэтадаў фізкультурнай работы ў адпаведнасьці з агульнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва стаіць са ўсёй рашучасьцю вышэйшае аб'ектыўнае ўдзяленьне кадрыхтоўцы пралетарскіх кадраў фізкультуры.

Праведены з апошні час рад мерапрыемстваў у галіне (адчыненьне Усесаюзнага тэхнікуму фізкультуры, правядзеньне цэнтральных і акруговых курсаў, сэмінараў і г. д.) усё-ж не вырашае праблемы фізкультурных кадраў у ВССР.

Трэба адзначыць, што і той склад інструктароў, які ёсьць зараз, па якасьці сваёй ні ў якім разе нас ня можа задаволіць. У складзе інструктароў зусім няма колькасьць рабочых (з 580 інструктароў — рабочых 236), тонкая партыйна-камсамольская праслойка (каля 17 проц.).

Сярод інструктароў ёсьць і сацыяльна варожы нам элемент, які стаіць у баку ад грамадзка-палітычнага жыцьця і імкнецца правялачыць у фізкультурны рух ідэйкі дробна-буржуазнай спартыўнай ідэалёгіі, аналітычнасьць, чэмпіёнства і г. д.

Усё гэта стаіць са ўсёй вострасьцю пытаньне аб узмацненьні кэмпаў падрыхтоўкі інструктарскіх кадраў з рабочых.

Ад работніка фізкультуры патрабуецца на тоўкі веданьне спартыўнай тэхнікі, уменьне выкладаць фізкультурныя прыстасаваньні, але ён павінен быць у першую чаргу грамадзкам, ён павінен увязваць фізкультурную работу з клясавымі задачамі пралетарыяту.

У гэтым годзе, паводле кантрольных лічбаў, павінны быць падрыхтаваны 700 інструктароў фізкультуры. Адначасова павінна быць праведзена перападрыхтоўка інструктарскага складу, які ўжо зараз знаходзіцца на практычнай работе.

У бліжэйшым часе трэба арганізаваць цэлы рад кароткатэрміновых курсаў для падвышэньня тэарэтычна-практычных ведаў для інструктароў, якія ўжо працуюць. У праграму гэтых курсаў абязкова ўключаць акрамя спэцыяльных, таксама і грамадзка-палітычныя пытаньні.

Пры тэхнікуме фізкультуры, які зьяўляецца асноўнай вышэйшай установай у Беларусі на падрыхтоўцы інструктароў, павінны быць арганізаваны, паводле прыкладу педагагічных тэхнікумаў кароткатэрміновыя курсы.

Набор у тэхнікум у гэтым годзе будзе павялічаны ў чатыры разы (замест 45 чал. будзе прынята — 180). Гэта патрабуе ўзмацненьня ўвагі з боку прафарганізацый да падбору кандыдатур з рабочых і арганізацыі для іх падрыхтоўчых курсаў, сэмінараў і г. д. Наркамасьветы павінен прыняць меры да забесьпячэньня нармальнай работы тэхнікуму ў сэнсе ўрэгуляваньня пытаньня аб памяшканьнях для вучэбнай работы і інтэрнатаў.

Прафарганізацыі павінны аддаць максымум увагі пытаньням арабочаньня складу інструктароў фізкультуры і падрыхтоўкі новых кадраў, адначасова аказваючы шырокую дапамогу найхутчэйшай перабудове фізкультурнай работы на прадпрыемствах.

З. Траскоўскі.

Орден Леніна тав. Сталіну

Вытворчая канфэрэнцыя ўдарнікаў ЗАВОДУ «ЭНЭРГІЯ» пастанавіла хадайнічаць перад ЦВК СССР аб узнагародзе ордэнам Леніна лепшага ўдарніка, лепшага вучня Леніна, правадыра Камуністычнай партыі тав. І. В. Сталіна.

У прэзыдыуме ЦСПСБ

Рабочы дзень для студэнтаў. Прэзыдыум ЦСПСБ прызнаў патрэбным скараціць на дзьве гадзіны рабочы дзень для студэнтаў, якія працуюць на прадпрыемствах, дзе няма 7-мігадзіннага рабочага дня, а там, дзе 7-мігадзінны рабочы дзень — на 1 гадзіну.

Камандыраваньні на факультэт сацыяльнага страхаваньня. Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў камандыраваць на вучобу на факультэт сацыяльнага страхаваньня ў Маскве 7 чалавек.

Рабочыя кадры для прамысловасьці. Паводле пастановы прэзыдыуму ЦСПСБ, арганізуюцца брыгады з ударнікаў і добраахвотнікаў для абсьледваньня падрыхтоўкі рабочых кадраў для прамысловасьці на лініі ВСНГВ, НКП, Белкаапсаюзу, Галоўдорпрансу.

Больш увагі інтэрнацыянальна-выхаваўчай рабоце

Пытаньне інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных зьяўляецца на сёньняшні дзень адным з галоўных пытаньняў, якое патрабуе пільнай увагі.

Апрача правядзеньня шматлікіх кампаній, якія прысьвечаны міжнароднай пралетарскай салідарнасьці мопрарганізацыі праводзяць таксама сыстэматычную і плянавую інтэрнацыянальна-выхаваўчую работу: арганізацыя мопраўскіх куткоў, вакол якіх канцэнтруецца ўся культурна-масавая работа, дошкі здарэньня, якія высьвятляюць ход клясавай барацьбы замежнага пралетарыяту з капіталізмам і жыцьцё палітэмігрантаў, у якіх групуюцца пытаньні аб міжнародным становішчы, пасылка лістоў палітэмігрантаў з іх папярэдняй масавай чытай сярод рабочых і працоўнага сялянства, распаўсюджаньне мопраўскай літаратуры і г. д.

Але ўся бяда ў тым, што работа па інтэрнацыянальным выхаваньні, якая праводзіцца МОПР'ам недаацэньваецца партыйнымі, прафесыянальнымі і камсамольскімі арганізацыямі.

Мопраўскія арганізацыі па прапагу 2-х год дабіваюцца ўвязкі сваёй работы з работай іншых грамадзкіх арганізацый і ў першую чаргу з прафесыянальнымі і камсамольскімі, але ўсе іх імкненьні застаюцца бязвыніковымі.

На большасьці фабрык і заводаў пры складаньні пляну работ культкамісій ФЗМК зусім ня прымаецца пад увагу работа МОПР'у. Большая частка партколектываў таксама на працягу году ня ставіць справаздачы бюро МОПР'у аб праробленай ім рабоце, я ўжо не гаварў аб жывым штодзённым кіраўніцтве.

Мопраўскія арганізацыі розных акруг ставілі перад камсамольскімі арганізацыямі пытаньне аб адкрыцьці пры камсамольскіх ячэйках кансультацый па інтэрнацыянальным выхаваньні камсамольцаў і рабочай моладзі, але камсамольскія арганізацыі гэтым пытаньнем зусім не зацікавіліся.

Па віне камсамольскіх арганізацый быў таксама правален месячнік па вярбоўцы камсамольцаў у рады МОПР'у.

У выніку мопраўскія арганізацыі на радзе прадпрыемстваў іспуюць толькі на паперы. На заводзе «Энэргія» мопраўская ячэйкі зусім няма, вельмі дрэнна пастаўлена мопраўская работа на заводах «Вальшавік», «Камунар», «Чырвоны Мэталіст» і інш.

Пытаньне аб інтэрнацыянальным выхаваньні працоўных можа быць выраішана толькі тады, калі ўся работа ў гэтым напрамку будзе цесна ўвязана з работай мопраўскіх арганізацый.

С. Брайнін.

Спыніць цкаваньне рабкораў

Справа рабкора Рэзьнікава, быццам, была ўрэгулявана. Але гэтая «ціішыня» аказалася часовай. Тыя, каго Рэзьнікаў крытыкаваў праз газэту праводзілі сваю агідную работу.

Новае цкаваньне пачалося з такога факту: Член партыі Затонец зрабіў прагул у «калядныя дні» і ў выніку гэтага не папаў у сьпіс лепшых рабочых. Затонец, лічачы вінаватым у гэтым тав. Рэзьнікава, стаў нагаварваць на яго, «што Рэзьнікаў кепскі рабочы, ён у цэху разводзіць розныя склокі і г. д.». Гэта было пад руку рабочым Плоткіну і Бандарэнку, аб якіх Рэзьнікаў ня раз пісаў у газэту, якія з свайго боку пускалі ў ход сыстэматычныя плёткі: «Рэзьнікаў школнік, ён заўсёды муціць цэх і г. д.».

Створаная атмасфэра вакол Рэзьнікава зусім недапушчальная. Рэзьнікаў ня можа працаваць пры такіх абставінах у адным цэху з паданымі рабочымі.

* * *

Прыказчыкі магазыну «Гудок» за безадказнае разбазарваньне дэфіцытных тавараў і за асабістае карыстаньне імі, атрымалі спагнаньне ад Рэчыцкага ЦРК. Зараз яны працягваюць свае злачынствы. Камсамолец Багданаў за ўсякі гэтай «рабоце» зьяўляецца перашкодай, бо пры непасрэдным удзеле Багданава «Дняпровец» выкрыў злачынствы. Пакуль ня пісалі ў газэту Багданаў лічыўся добрым прыказчыкам, нават, загадчык крамы Бабчанка рэкамандаваў яго, як лепшага прыказчыка. Як толькі газэта загаварыла аб недахопах фабрычнага магазыну «Гудок», Багданаў стаў кепскім прыказчыкам. Сталі нагаварваць, што Багданаў не адпавядае свайму назначэньню і пры садзейнічаньні загадчыка Бабчанкі агульны сход ухваліў: «узмацніць мануфактурны аддзел, даць туды больш моцнага таварыша» (гэта датычыцца Багданава).

Такую пастанову нельга інакш разглядаць, як жаданьне пазбавіцца ад таварыша Багданава.

Мы лічым, што адпаведныя органы зоймуцца расьсьледваньнем гэтай справы і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці, гэтым самым раз назаўсёды паложаць канец цкаваньням і ганеньням актывістых рабкораў.

Курсы для жанчын-старшынь сельсаветаў

15 чэрвеня пры ЦВК БССР адкрываюцца двухмесячныя курсы на падрыхтоўцы жанчын - актывістак батрачак, бяднячак і калгасьніц, якія непасрэдна працуюць на пасадах старшынь і сакратароў сельсаветаў.

Практыка перападрыхтоўкі мінулага году паказала, што жанчыны, якія скончылі курсы і былі вылучаны з нізавой на кіраўнічую работу, поўнасьцю апраўдалі сябе на новых пасадах. Жанчыны —члены саветаў данамаглі ахапіць кіраўніцтвам вясковы актыў, уцягнуць яго ў работу праз камісіі пры сельсаветах, уцягнуць ва ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве шматлікія колы батрацтва і бядняцтва.

Павялічэньне ў часе мінулай перавыбарнай кампаніі процанту жанчын у складзе старшынь сельсаветаў з 0,8 % да 7,4% патрабуе ўвагі да перападрыхтоўкі жанчын-сельсаветчыц.

Кароткатэрміновыя курсы, якія сёньня адкрываюцца, павінны даць сацыяльна-палітычныя і адміністрацыйна-тэхнічныя веды, патрэбныя ў штодзённай рабоце жанчын—старшынь і сакратароў сельсаветаў. Галоўная ўвага на курсах будзе зьвернута на распрацоўку пастаноў XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсесКП(б) для таго, каб выпускнікі курсаў маглі выразна арыентавацца ў партыйных дырэктывах наконт сацыялістычнай рэканструкцыі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі.

Курсанты павінны ўсебакова азнаёміцца з умовамі жыцьця і працы работніц на вытворчасьці, што, бязумоўна, будзе спрыяць узмацненьню сувязі рабочай клясы і працоўнага сялянства.

Мікуліч.

МЕНСК

Выпуск рабфаку

13-га чэрвеня ў клюбе харчавікоў адбыўся ўрачысты выпуск ранішняга рабфаку БДУ. Рабфак скончылі 83 чалавекі. На агульным сходзе студэнты пастанавілі працягваць вучобу ў ВНУ і ВТНУ БССР.

Выпускнікоў віталі нам. Наркамасьветы тав. РЫЎЛІН, нам. рэктара БДУ акадэмік ВАЛЬФСОН, прадстаўнік райкому КП(б)Б тав. ЭПШТЭЙН і інш.

Новая тэлефонная аўтаматычная станцыя ў Менску

У Менску, па вул. К. Маркса, пачата падрыхтоўчая работа да пабудовы новай аўтаматычнай тэлефоннай станцыі. Ёмкасьць будынку станцыі—10 тыс. кубамэт. Праект станцыі ўжо гатовы.

Падрыхтоўка настаўнікаў

СНК абавязаў Бабруйскі, Віцебскі, Менскі, Магілеўскі, Мазырскі і Полацкі АВК арганізаваць не пазьней 1-га ліпеня 1930 году кароткатэрміновыя курсы на 100 чалавек для падрыхтоўкі настаўнікаў.

Тэхнікум сувязі

Распрацоўваецца праект арганізацыі ў Менску тэхнікуму сувязі ў складзе тэхнічнага і эканамічнага аддзяленьняў. Тэхнікум будзе рыхтаваць тэхнікаў пошты, тэлеграфу, тэлефону, радыё і эканамістых сувязі. Тэрмін навучаньня мяркуецца ўстанавіць у 2 з палов. гады для эканамічнага аддзяленьня і 3 гады для тэхнічнага. Для будаўніцтва тэхнікуму патрабуецца 1.200.000 руб.

Новыя акцыянэрныя таварыствы і трэсты

Калегія Наркамзему пастанавіла арганізаваць у БССР аддзяленьне Трактарацэнтру СССР. Упоўнаважаным Трактарацэнтру назначаны тав. Шкурдзэ.

У складзе Наркамзему арганізуецца гідра-тэхнічны мэліярацыйны трэст «Белмэліябуд». Трэст пачне сваю работу з новага гаспадарчага году.

Наркамзем БССР выказаўся за арганізацыю ў Беларусі канторы ўсесаюзнага акцыянэрнага таварыства па барацьбе са шкоднікамі сельскае гаспадаркі. Наркамзем просіць акцыянэрнае таварыства ўкамплектаваць беларускую кантору патрэбнай колькасьцю работнікаў.

Тэлефанізацыя і радыёфікацыя калгасаў

Белкалгасцэнтр заключыў дагавор з Беларускім Кіраўніцтвам Сувязі на тэлефанізацыю і радыёфікацыю на працягу трох год каля 14 раёнаў. Усю апаратуру і тэхнічную сілу дасьць кіраўніцтва сувязі, а рабочую сілу і слупы—калгасы. У раёнах будуць абсталяваны радыёвяшчальныя вузлы, якія будуць перадаваць радыё ў калгасы па тэлефоне.

Забесьпячэньне Менску фруктовымі водамі

Пры Менакрганідзе адбылася нарада па пытаньні забесьпячэньня Менску і Барысава сельтарскай і фруктовымі водамі. Нарада адзначыла, што завод «Беларусь» і менскае аддзяленьне Белсампрамсаюзу не прынялі патрэбных мер да забесьпячэньня Менску і Барысава фруктовымі водамі. Нарада запрапанавала заводу «Беларусь» і саматужнай каапэрацыі напырыць вытворчасьць вод, выкарыстаць транспарт «УМТ'у для свячасовай дастаўкі напіткаў, палепшыць якасьць прадукцыі.

Курсы савецкіх працаўнікоў

Пры факультэце савецкага будаўніцтва БДУ ў гэтым годзе адкрываюцца курсы для падрыхтоўкі працаўнікоў савецкіх органаў. Тэрмін навучаньня—тры гады.

Перападрыхтоўка прафкадраў

ЦП саюзу харчавікоў асыгнавала звыш 13.000 руб. на арганізацыю курсаў па перападрыхтоўцы прафкадраў. На курсы будзе прынята 80 чалавек.

На барацьбу з сухотамі

14-га, 15-га і 16-га чэрвеня па Менску праводзіцца сухотны трохдзеньнік. Арганізуецца скарбоначны збор, будзе працытан рад лекцый аб сухотах.

У гэтыя дні ўсе сілы органаў аховы здароўя, савецкай грамадзкасьці, мэдычнага пэрсаналу, аб'яднаных у савет сацыяльнай дапамогі пры сухотным дыспансэры, будуць кінуты ў атаку на ворага.

Тубэркулёз — яшчэ моцны вораг. Праўда, мы з ім доўга і ўпарта змагаемся, адваёўваючы для жыцьця і будаўніцтва маладыя сілы. Праўда, мы мабілізуем усе нашы сілы, аздараўляем працу і быт, арганізуем саветы сацыяльнай дапамогі, будуем дыспансэры, інстытуты і санаторы, украняем у масы санітарна - гігіенічныя навыкі, але ўсё-ж барацьба з сухотамі патрабуе ад нас яшчэ большага напружаньня, яшчэ большае работы.

Лічбы гавораць, што сьмяротнасьць ад сухот за апошнія 6 год зьнізілася больш, чым у тры разы. У 1924 годзе памёрла ад сухот па Менску 361 чалавек, а ў 1929—114. Лічбы гавораць аб тым, што з ростам эканамічнай магутнасьці краю, з разьвіцьцём рабочага заканадаўства, з ростам мерапрыемстваў па ахове мацяры і дзіцяці зьнижаецца сьмяротнасьць ад тубэркулёзу.

У нашым краі мы ўладаем, як ні ў адным краі ў сьвеце, глыбокапрадуманым прапоўным заканадаўствам.

Змаганьне з сухотамі вядзецца ў нас паводле выпрацаванага даяржаўнага пляну. Аднак, і зараз сухоты забіраюць у магілу тысячы маладых жыцьцяў, карысных і неабходных нашай грамадзкасьці.

Трохдзеньнік мае па мэце прыцягнуць да барацьбы з сухотамі арганізаваныя масы заводаў, фабрык, калгасаў і вёсак.

Арганізацыйны камітэт па правядзеньні трохдзеньніка заклікае ўсіх працоўных гораду падтрымаць трохдзеньнік і дапамагчы органам аховы здароўя з большым посьпехам змагацца са злосным ворагам рабочае клясы—тубэркулёзам.

Доктар А. ПОЛЯК.

Кіраваньне „па канвэеры"

Многа ўжо гаварылася і пісалася аб бязадушным мэханічным выкананьні дырэктыў, як аб адным з узораў бюракратычных мэтадаў работы.

Вось адзін з шматлікіх прыкладаў.

Згодна дырэктывы Саюзнаркамгандлю кантрактацыя ільну-семя павінна была праводзіцца ня з усёй плошчы кантрактаванага ільну-валакна, а прыблізна з 50 проц.

Эканамісты Наркамгандлю БССР тав. Кізіла, які павінен быў праводзіць гэту дырэктыву, лічылі яе зусім правільнай. Калі абгаворвалася гэтае пытаньне, ён даказваў, што найбольш лепшае валакно дае лён, які збіраецца ў пэрыяд яго цьвіценьня, а гэта значыць да моманту пасьпяваньня насеньня; што ў нас, у БССР, павінен культывавацца лён-даўгунец—у асноўным на валакно, а ня кудраш.

Але вось трохі і пазьней, калі Саюзнаркамгандлю зьмяніў сваю ранейшую дырэктыву і прапанаваў кантрактаваць насеньне ільну з усёй плошчы кантрактацыі валакна, тав. Кізіла адразу выкінуў з галавы тыя довады, якія ён увесь час угрупітоўваў і ў якіх ён упэўнен і цяпер, і мэханічна дае на месцы новую дырэктыву. Такая канвэерная перадача дырэктыў баз іх практычнай ацэнкі гаворыць аб тым, што т. Кізіла прытрымліваецца строга бюракратычнага прынцыпу: «Начальство лучше знает».

І вось паўстае пытаньне, калі-ж там Кізіла даў правільную дырэктыву—першы, ці другі раз? Ці можа тав. Кізіла лічыць, што ў адным пытаньні можна даць дзьве адна другую выключаючыя дырэктывы, каб пры гэтым абедзьве былі правільнымі.

Irna.

Навіны Белдзяржкіно

Ленінградзкая фабрыка Белдзяржкіно скончыла пастаноўку палітасьветфільмы ў 5 эпізодах з пралёгам, пад назвай «Канец жывых машын». Сцэнары распрацаваны Анты-Палоўскім па тэме Платонава. Фільм дэманструе ўмовы працы і тэхніку вытворчасьці ў саматужных поўмэханічных хлебапякарнях і на мэханічным хлебазаводзе.

— Зацьверджана Галоўрэпэрткомам БССР культурная фільма ў 2 частках пад назвай «Маланка» паводле сцэнарыя Шрэйбера. Карціна дае навуковым тлумачэньні аб пахаджэньні маланкі і выкрывае рэлігійныя забабоны. Рэжысэр Саламонік.

— Прыняты да пастаноўкі сцэнары «Сонечны паход» на тэму аб тым, як бядняцка-серадняцкія масы глухой палескай вёскі, ва ўмовах жорсткага клясавага змаганьня з кулацтвам, будавалі калгас. Сцэнары А. Вольнага, рэжысэр Корш.

— Прыступлена да пастаноўкі карціны «Рубікон» паводле сцэнарыя Менскага. Тэма фільмы—рост клясавай пралетарскай сьвядомасьці ў замежнага марака, які прыехаў у СССР. Рэжысэр Вайнштон, аператар Кальцаты. У галоўнай ролі—Б. Шліхтынг.

— Ленінградзкая фабрыка Белдзяржкіно прыняла да пастаноўкі сцэнары кароткамэтражнай культурфільмы «Тэлефон». Сцэнары наглядна паказвае прынцып перадачы гуку на адлегласьць канструкцыю тэлефону, мікрафону і тэлефоннай станцыі, а таксама значэньне тэлефоннай сувязі для СССР.

З лістоў рабселькораў

ПРАПАДАЮЦЬ СЬВІНЬНІ

Рагачоўскі райкалгассаюз не клапоціцца аб сваіх калгасах, не клапоціцца аб памяшканьнях для жывёлы. У калгасе «Роўнасьць» няма для жывёлы хлявоў і сьвінухоў. Сьвінні знаходзяцца ў лазьнях, у выніку—прападаюць. Ня раз складаліся акты аб прападаньні сьвіней, але райкалгассаюз ня думае прымаць якіх-небудзь мер для зьнішчэньня паказаных недахопаў.

Г. Мэйцін.

ЧАМУ ВЫСЯЛІЛІ НІКОЛЬСКАГА?

Доктар Нікольскі А. на працягу 30 год працаваў у Койданаўскай больніцы. Зараз ён інвалід 3-й групы і мае 72 гады. На працягу апошніх двух год Нікольскі жыў у мястэчку Койданаве. Дом, у якім ён жыў, зараз адышоў пад камгас. Кватэра Нікольскага мела добры выгляд, бо апошні выдаткаваў на рамонт яе 75 руб.

Старшыні РВК спадабалася кватэра Нікольскага. Урэшце, старшыня РВК прапанаваў Нікольскаму выбрацца з кватэры, як быццам таму, што гэты дом адыходзіць пад установу. Праз нейкі час старшыня заняў сам кватэру.

Дом, у які перасялілі Нікольскага, згодна пастановы Койданаўскага РВК, перададзены калгасу. Зараз Нікольскага высяляюць і з гэтай кватэры.

РСІ неабходна зацікавіцца гэтым пытаньнем.

П.

БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ

На тэрыторыі пабудовы макаронпай фабрыкі (Нова-Барысаў) на працягу некалькіх месяцаў ляжыць пад адкрытым небам звыш 250 пуд. жалезнага лому і іржавее. Адміністрацыя ня прымае ніякіх захадаў, каб перадаць гэты лом Рудмэталягандлю. Ня раз пісалася ў насьпенгазэтах аб гэтым, але адміністрацыя дае прыблізна такі адказ: «Што нам з таго, што пішуць газэты. Яны хай сабе пішуць. Затое ўсе будуць ведаць аб нашай фабрыцы».

Неабходна трэба здаць лом Рудмэталягандлю.

Г. КУГЕЛЬ.

ТРЭБА ПЕРАВЫБРАЦЬ РЭДКАЛЕГІЮ

Рэдкалегія насьпенгазэты пры Менакрфа нічога ня робіць. Па сваёй форме газэта зьяўляецца «Ільлічоўкай». Але на працягу звыш месяца ня зьмешчана ні адной заметкі. Да гэтага часу газэта не закранула пытаньня аб ударніцтве і г. д. Рэдкалегія сьпіць. Рабкоры ня пішуць, бо матар'ял не зьмяшчаецца. Так, рабкор Б. здаў заметку рэдкалегіі, але апошняя праляжала больш трох тыдняў і ня зьмешчана. Трэба прыняць захады да ажыцьцяўленьня работы рэдкалегіі насьпенгазэты.

ПЯРО.

НЕ КЛАПОЦЯЦЦА АБ ПАБУДОВЕ СКЛАДЗКІХ ПАМЯШКАНЬНЯЎ

Згодна пастановы ўрадовых органаў, ліквідаваліся ўсе экспэдыцыйна-транспартныя канторы: Саўтандальфлёту, акц. т-ва «Транспарт», гарадзкая станцыя, замест якіх арганізавана буйная кантора пад назвай «Саюзтранс». На апошнюю ўскладзена ўся адказнасьць за перавозку і хаваньне грузаў.

Акрамя таго, ускладзена на «Саюзтранс» падрыхтоўка складачных памяшканьняў для хаваньня хлебных грузаў. Летась мелі месца факты вялікіх прастояў вагонаў. Але для ўнікненьня гэтага нічога ня робіцца. Ніхто не клапоціцца аб водпуску жалеза і матар'ялаў для пабудовы стайняў і складачных памяшканьняў. «Саюзтранс» ня раз зварачаўся да асобных арганізацый, як ВПТ, Наркамгандаль, Саюзлес, але не атрымаў ніякай дапамогі, каб свячасова прыступіць да будаўніцтва складачных памяшканьняў і г. д.

РСІ павінна гэтым пытаньнем зацікавіцца.

САЎГАС НЯ ВЫКАНАЎ САЦДАГАВОРУ

Калгас «Новае Жыцьцё», Коханаўскага раёну, заключыў сацдагавор з саўгасам Гаршэўшчына на больш хутчэйшы размін засеву яравога кліну. Але саўгас ня выканаў сацдагавору. Калгас свой план сяўбы паравыканаў на 70 проц. за лік павялічэньня тэхнічных і інш. культур. Зараз калгас прыступіў да будаўніцтва. Саўгас-жа Гаршэўшчына да гэтага часу ня скончыў сяўбы і ня выканаў сацдагавору.

А—ў.

БУДУЮЦЬ І РАЗБУРАЮЦЬ

На пабудове дому ўраду работа праводзіцца безгаспадарча. Напрыклад, адзін дзень тынкаваліся сьцены, а на другі дзень тынкаваньне пераробляліся. На разбураньне сьцяны ў мэтраў 70 было настаўлена некалькі чалавек. Такія работы паўтараюцца часта.

Тэхнічны пэрсанал павінен зьвярнуць на гэта самую сур'ёзную ўвагу.

Г. М.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЕНЬНЯ

БДУ. У канцылярыі праўленьня унівэрсытэту адбудзецца сход брыгадзіраў, якія прымалі ўдзел у правядзеньні надрыхтоўчай кампаніі да прыёму ў БДУ. Яўка брыгадзіраў абавязкова. Пач. а 6 гадз. веч.

САД НАРХАРЧ. А 8 гадз. веч. адбудзецца антырэлігійны вечар. Даклад з дэманстрацыяй «цудаў». Уваход вольны. Запрашаюцца рабочыя і работніцы. У заключэньне—кіно.

ЗАЎТРА

БДУ. У 41 аўд. (ст. будынак) адбудзецца зачынены партсход ячэйкі КП(б)Б саўбуд. і права. Яўка членаў і канд. абавязкова Пач. а 8 гадз. веч.

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Фрунз РК КП(б)Б. А 5 гадз. веч. павінны зьявіцца дэлегаты ўсіх 3 груп Фрунз. райкому для ўдзелу ў арганізаванай экскурсіі. Збор у памяшканьні клюбу працасьветы. Яўка абавязкова.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
ПРЭМ'ЕРА
Пастановы Прэмірленыя Білеты
Сёньня, 15 чэрвеня пастановкі мастацкага перасовачнага тэатру «КРАСНЫЙ ФАКЕЛ»
„НАШЕСТВИЕ НАПОЛЕОНА"
Па рэжысэра тэатру рэвалюцыі В. Ф. Фёдарава.
Мастака І. Ю. Шлепянава. Музыка Лістава.
У рабочай касе, астача білетаў у касе тэатру.
Пачатак а 8 г. 30 хв. увечары.

Тэатр саду „Прафінтэрн"
Гастролі 1-га Маскоўскага перасовачнага тэатру ОПЭРЫ і БАЛЕТУ
Сёньня, 15 чэрвеня
„ТРАВИАТА"
муз. Вердзі.
Білеты ў касе тэатру і ў рабочай касе.
Пачатак а 8 г. 30 м. веч.

Кіно-тэатр „Культура"
Толькі 2 дні 14, 15 чэрвеня падвойная вялікая праграма
Дзекабрухаў і Анцібрухаў камэдыя ў 6 част.
5 год будаўніцтва СССР
Пачатак а 8 г. і а 10 г. Каса—ад 6 гадз.

Кіно Інтэрнацыянал
2-гі ТЫДЗЕНЬ
Мастацкая кіно-аповесьць
ВЕЦЕР у ТВАР
— ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: —
Кіно-хроніка Белдзяржкіно „Беларусь Савецкая № 6"
Прысьвечаная XIII зьезду КП(б)Б
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса—ад 5 г.

Кіно САД (Савецкая, 71)
Новы замежны мастацкі фільм
РВАНЫЯ ВЕТРАЗІ
— у 8 частках —
ПАЧАТАК 1-га СЭАНСУ а 6 ГАДЗ.
Каса адкрыта з 6 гадз.

Кіно Пралетарый
АПОШНЯЯ 3-я СЭРЫЯ
— МІС МЭНД —
у 10 частках
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз.
Каса адкрыта з 5 гадз.

Кіно-тэатр Юны Піянэр
2-ГІ ТЫДЗЕНЬ
„КРАСНЫЕ ДЬЯВОЛЯТА"
-2 сэрыі 12 частак у адзін сэанс
Пачатак 1-га сэансу а 2 гадз.
Каса адкрыта з 12 гадз.

Кіно Спартак
Нямецкі мастацкі баявік
ЧЭМПІЁН СЬВЕТУ ў 7 част.
У галоўнай ролі КСЕНІЯ ДЭСЬНІ
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз., 2-га—9 гадз.
Каса—з 5 гадз. 30 м.

15 чэрвеня, а 7 гадз. увечары ў клюбе глуханямых па Савецкай вуліцы адбудзецца
АГУЛЬНЫ СХОД ЧЛЕНАЎ ЖАКТ'у
і жыхароў уніў прынятых дамоў ЖАКТ'у № 16.
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Аб пе[illegible] выбарах праўленьня і рэвкамісіі.
2. Выбар[illegible] брыгад і выбарчай камісіі для праверкі працы.
3. Прый[illegible] у члены ЖАКТ'у.
ПАСЬЛЯ СХОДУ—КІНО.

ДРОЖЖЕВЫЕ МАСТЕРА
[illegible]жения с кратким жизнеописанием [illegible]ять в гор. Москву—Крестовский пер. № 3 „СЕЛЬПРОМОБ'ЕДИНЕНИЕ".

Дом Асьветы 15 чэрвеня
КАНЦЭРТ ансамблю жаночай творчасьці
Прымаюць удзел: артыстка савецкай філярмоніі Роза УМАНСКАЯ (скрыпка), артыстка Маскоў. н. Дзярж. Оперы А. А. ЛАРЫНА (сапрано) і салістка савецкай філярмоніі М. А. ГРЫНБЭРГ (раяль).
У праграме—творы расійскіх і замежных кампазытараў.
БІЛЕТЫ Ў КАНЦЫЛЯРЫІ ДОМУ з 12—2 і з 6—10 гадзін увечары.

Кіно ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ
Ад нядзелі 15 чэрвеня
— Нямецкі фільм —
вытворчасьці «УФА - ФІЛЬМ»
„Дзелавы чалавек"
У галоўных ролях:
РЫТА РОБЭРТС
ФРЫЦ КАМПЭРС
—ВІЛІ ФОРСТ—
Пачатак 1-га сэансу а 7-й гадз.
— Каса—ад 5 гадзін. —

Скрыгалаўскі Культуртэхнікум, Мазырскай акругі з 3-гадовым тэрмінам навучаньня па падрыхтоўцы агрономаў культуртэхнікаў
ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО
ПРЫЁМ ЗАЯЎ на 1930-31 г.
пачынаецца з 1-га ліпеня па 1-е жніўня.
Правілы прыёму абвешчаны падрабязна ў газ. «Чырвоная Зьмена» ў чэрвені месяцы.
Дырэктар Тэхнікуму КУРДО.

Беларуская Цэнтральная Дасьледчая Сьвінягадоўчая станцыя
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА, ШТО
ПРЫЁМ НАВЕДВАЛЬНІКАЎ НА СТАНЦЫІ
адбываецца 5, 10, 15, 20, 25, 30 кожнага месяца.
У іншыя дні ПРЫЁМУ НЯМА
ДЫРЭКТАР СТАНЦЫІ.

50 кошт публікацыі аб згубе дакумэнту

Правілы прыёму ў Марына-Горскі садова-гародны тэхнікум на 1930-31 нав. год.
Тэхнікум у гэтым нав. годзе будзе мець тры аддзяленьні: садова-гароднае, тэхперапрацоўчае і пчалярнае. Прыём адбудзецца два разы ў год. Усяго прымаецца 320 чал.: у ліпені г. г. 160 чал., у студзені 1931 г.—160 чал.
У тэхнікум прымаюцца асобы ўзросту ад 15 да 25 год, якія скончылі поўны курс 9-гадовай працоўнай школы II ступені, 2-гадовыя агульна-асьветныя курсы, сямігадовую працоўную школу, школу для дарослых павышанага тыпу, школу рабочай моладзі, школы сялянскай моладзі, прафшколу на базе 4-годкі пасьля 3-гадовага вытворчага стажу і курсы па падрыхтоўцы ў тэхнікум.
Таварышы, якія скончылі вышэйпамянёныя школы прымаюцца бяз іспытаў, а якія ня скончылі—прымаюцца з іспытамі.
Камплектаваньне робіцца па сацыяльным адборы.
Прыём заяў з 1 чэрвеня па 25 ліпеня г. г.
Заявы падаюцца на імя прыймовай камісіі пры тэхнікуме. Да заявы далучаюцца наступныя дакумэнты:
1. Аб узросьце (мэтрыка).
2. Адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын).
3. Адукацыя.
4. 2 фатаграфічныя карткі.
5. Мэдычнае пасьведчаньне аб стане здароўя паступаючага.
6. Аб сацыяльным становішчы паступаючага і яго бацькоў—да рэвалюцыі і пасьля рэвалюцыі.
7. Даведка аб тым, што паступаючы і яго бацькі маюць выбарчае права голасу.
8. Анкету, засьведчаную прафэсыянальнымі або савецкімі арганізацыямі.
9. Паштовых марак для адказу на 20 кап.
10. Тэрмін іспыту і залічэньня з 25 ліпеня па 10 жніўня г. г.
Усе асобы, якія падалі заявы, аб выніках паступленьня ў тэхнікум атрымаюць паведамленьне.
Пачатак заняткаў з першымі нурсамі з 1 кастрычніка г. г.
Дырэктар тэхнікуму С. А. Глушаноўскі.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ГАРАНЗКОГА КАМІТЭТУ УЗАЕМАДАПАМОГІ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл. 12-66
АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. веч.
Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:
па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г 30 м. да 9 г. увеч.
Прыём хаміка-бактэрыялёгічных аналізаў. Аптэка.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. веч. штодзённа
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.
Дэжурныя дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.
Начное дэжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз раніцы.
Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту
Для ўсіх іншых грамадзян за агульна-даступную дыфэрэнцыяваную плату.

Для здачы КВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" зазваць на тэл. 7-81

ЗГУБЛЕНА пячатка дзіцячай калёны «Малады Араты» лічы